УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД ПРОЙДЗЕ Ў ЛЮТЫМ 2

ЭКАЛОГІЯ І ЭТНАГРАФІЯ ПАЛЕССЯ... У ФОТАЗДЫМКАХ 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 СНЕЖНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 253 (29367)

ЦЫТАТА ДНЯ

Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:

«Па пастаўках нафты ў Беларусь ідзе працэс падпісання кантрактаў з пастаўшчыкамі. З шэрагам буйных пастаўшчыкоў ужо падпісаны пагадненні аб пастаўцы нафты трубаправодным транспартам у наступным годзе. З часткай яшчэ ідуць узгадненні асобных дробных умоў. Да канца года абсалютна ўсе кантракты на пастаўку нафты ў Беларусь будуць падпісаныя. Гэта традыцыйныя навагоднія пытанні, у бягучым годзе ніякай напружанасці няма, абсалютна планава яны вырашаюцца. Мы дамовіліся з урадам Расійскай Федэрацыі аб тым, што не трэба складаць усё «пад ёлачку».

«Мірныя» сцежкі-дарожкі

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Добраўпарадкаванне пешаходных дарожак у адным з кварталаў шматфункцыянальнага комплексу «Minsk-World», які ўзводзіцца.

КАРАТКА

• У Беларусі за 2015—2020 гады колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася на 40 %.

• **Беларуская дзяржаўная філармонія 12 студзеня запрашае на канцэрт «Я нясу вам дар» да 80-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна.**

• Запас сродкаў індывідуальнай абароны работнікаў аховы здароўя ў цэлым па рэгіёнах за тыдзень вырас на 5—10 %.

ISSN 1990 — 763X

З папраўкай на пандэмію

«ВІРУС КІЕМ АДГАНЯЮ»

Як рыхтуюцца да свята, каго чакаюць у госці жыхары невялікіх аддаленых вёсак

Зараз усе актыўна рыхтуюцца да навагодніх свят. Жыхары вялікага горада наведваюць гандлёвыя цэнтры, купляюць падарункі, карэктуюць планы святочных сустрэч на прадмет таго, з кім убачыцца асабіста, а каго павіншаваць у рэжыме анлайн. Гаспадыні набываюць прадукты, абдумваюць меню, каб парадаваць блізкіх. Адным словам, прывычным перадсвяточным вэрхалам ахоплены вялікія і малыя гарады, пасёлкі, аграгарадкі. А як сустракаюць свята жыхары маленькіх вёсачак на ўскраінах? — задалася я пытаннем і патэлефанавала некаторым героям сваіх матэрыялаў. Яны расказалі.

Вольга ГРЫЦУК.

СТАР. 4

Соцыум

Жыць і працаваць па-новаму, або Як пандэмія каранавіруса змяніла мысленне людзей

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Пандэмія паўплывала на жыццё практычна кожнага чалавека. Але найбольш яна закранула пажылых. Людзі старэйшага пакалення, у якіх шмат суправаджальных хвароб, вымушаны спыніць або звесці да мінімуму кантакты са знешнім светам. Ім вельмі не хапае жывых зносін з сябрамі, блізкімі, суседзямі. Карэспандэнт наведала Капыльскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнай абароны насельніцтва (ТЦСАН), што на Міншчыне, і паглядзела, як тут працуюць са сваімі падапечнымі ў сённяшніх няпростых умовах.

СТАР. 5

Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«Усе новаўвядзенні павінны служыць адной мэце — нашым людзям і іх дабрабыту»

На нарадзе ў Прэзідэнта абмеркавалі змест галоўнага даклада на VI Усебеларускім народным сходзе.

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка назваў канкрэтную дату правядзення форуму — 11—12 лютага. Нарада прайшла з удзелам спікераў беларускага парламента, прэм'ер-міністра, кіраўніцтва Адміністрацыі Прэзідэнта і дырэктара Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў.

«Зразумела, найважнейшы форум, скажам так — пяцігоддзя, — абазначыў Аляксандр Лукашэнка і дадаў: — Паколькі вялікае відаць на адлегласці, праз некаторы час, магчыма, мы зразумеем, што гэта найважнейшы форум і ў гісторыі нашага народа ў сілу таго моманту, які краіна перажыла».

Усебеларускі з'езд вызначыць, як краіна будзе жыць, мінімум — у будучыя пяць гадоў, па якіх галоўных кірунках будзе развівацца грамадства, дадаў беларускі лідар.

«Ведаю, на сённяшні дзень вырашаны шэраг арганізацыйных пытанняў. Створаны і распачалі работу рэспубліканскі і рэгіянальныя аргкамітэты. Літаральна з заўтрашняга дня мы пачынаем абранне дэлегатаў», — сказаў ён.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што гэта павінны быць людзі, якія прадстаўляюць усе пласты і групы насельніцтва, увесь беларускі народ.

«Так у нас было заўсёды, пачынаючы з першага сходу 1996 года, калі мы правялі свой першы Усебеларускі народны з'езд. Тады было таксама няпроста, добра памятаеце: нагняталася супрацьстаянне, але мы змаглі аб'яднаць людзей і накіраваць энергію грамадства на карысць краіне», — нагадаў ён.

Цяперашні час Аляксандр Лукашэнка назваў «яшчэ больш неадназначным».

«Такога знешняга ціску Беларусь не адчувала ніколі, — заявіў ён. — ***У гэтым асаблівасць сённяшняга часу і цяперашняга Усебеларускага народнага сходу».***

Кіраўнік дзяржавы пералічыў асноўныя пытанні, якія будуць разгледжаны на глабальным нацыянальным форуме.

«На сходзе мы павінны падвесці вынікі пяцігодкі, адкрыта сказаць пра тое, чаго дасягнулі, што не атрымалася і чаму, — сказаў ён. — Трэба дэталёва разгледзець Праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця на пяцігодку. Ацаніць механізмы, з дапамогай якіх зможам у вельмі складаных знешніх умовах забяспечыць эканамічны рост і захаваць нашу мадэль сацыяльнай дзяржавы».

Геапалітычнае і эканамічнае супрацьстаянне будзе толькі нарастаць, ды і пандэмія ў найбліжэйшы час нікуды не дзенецца, звярнуў увагу Прэзідэнт.

«Таму ўсе новаўвядзенні, якія мы будзем прапаноўваць, абавязкова павінны служыць адной мэце — нашым людзям і дабрабыту людзей. Ніякіх рашэнняў, каб дагадзіць замежным «дарадцам» і іх тутэйшым прыхільнікам, быць не павінна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Вакол гэтых галоўных пастулатаў неабходна будаваць і канцэпцыю асноўнага даклада, і яго абмеркаванне, лічыць кіраўнік дзяржавы.

«Наша бачанне і прапановы ўдзельнікам Сходу павінны быць канкрэтныя і адлюстроўваць рэальныя праблемы і спадзяванні людзей, — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да ўдзельнікаў нарады. — ***Нам не патрэбны адарваныя ад жыцця тэорыі. Патрэбны адказ на існыя запыты грамадства. Пры гэтым варта вывучыць самы шырокі спектр меркаванняў і разважанняў нашых грамадзян».***

Беларускі лідар адзначыў, што ў перыяд падрыхтоўкі да Сходу арганізаваны шырокі грамадскі дыялог. У рэгіёнах, працоўных калектывах, ВНУ працягваецца абмеркаванне асноўных кірункаў развіцця краіны.

На месцах дзейнічаюць грамадскія прыёмныя, дзе кожны можа выказаць сваё меркаванне і ўнесці прапановы па гэтых пытаннях.

«Сёння выказацца можа кожны, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — ***Гэта і ёсць плюралізм меркаванняў, неабходны для прыняцця правільных кіраўнічых рашэнняў, выбудоўвання эфектыўнага балансу паміж інтарэсамі дзяржавы і грамадства».***

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Прэзідэнт падпісаў Указ аб Усебеларускім народным сходзе

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 492 аб скліканні VI Усебеларускага народнага сходу, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

У адпаведнасці з артыкулам 37 Канстытуцыі Беларусі і ў мэтах рэалізацыі канстытуцыйнага права грамадзян удзельнічаць у абмеркаванні пытанняў дзяржаўнага і грамадскага жыцця краіны Прэзідэнт пастанавіў склікаць 11—12 лютага 2021 года ў Мінску VI Усебеларускі народны сход. На абмеркаванне яго ўдзельнікаў будуць вынесены асноўныя палажэнні Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2021—2025 гады і кірункі грамадска-палітычнага развіцця краіны.

Агульная колькасць удзельнікаў і запрошаных асоб VI Усебеларускага народнага сходу складзе 2700 чалавек. Удзельнікі форуму ад абласцей і Мінска абіраюцца з улікам нормаў прадстаўніцтва раённымі і гарадскімі Саветамі дэпутатаў і найбольш шматлікімі грамадскімі аб'яднаннямі. Пры гэтым ад кожнай вобласці ў сходзе прыме ўдзел не больш за 310 чалавек, ад Мінска — не больш за 370.

Пералік запрошаных асоб фарміруецца Рэспубліканскім арганізацыйным камітэтам па падрыхтоўцы і правядзенні VI Усебеларускага народнага сходу з ліку кіраўнікоў дзяржаўных органаў і арганізацый, прадстаўнікоў мясцовых Саветаў дэпутатаў, грамадскіх аб'яднанняў, сродкаў масавай інфармацыі, супрацоўнікаў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў замежных дзяржаў у Беларусі, прадстаўнікоў беларускіх дыяспар, міжнародных і замежных арганізацый у краіне.

• У тэму

VSEBEL.BY

Менавіта так называецца сайт VI Усебеларускага народнага сходу, на які могуць зайсці ўсе жадаючыя. Тут размяшчаюцца інфармацыйныя матэрыялы аб падрыхтоўцы і правядзенні сходу, паведамляе БелТА.

На сайце Усебеларускага народнага сходу прадстаўлены матэрыялы з розных інфармацыйных крыніц: аналітычныя і інфармацыйныя артыкулы друкаваных выданняў, фота- і відэасюжэты тэлевізійных каналаў і электронных платформ, інфармацыйнага агенцтва БелТА.

Сайт абнаўляецца штодня ў рэжыме анлайн. Матэрыялы размяркоўваюцца па рубрыках: «Навіны», «Фота», «Відэа», «Гісторыя». У раздзеле, прысвечаным гісторыі форуму, можна азнаёміцца з разгорнутым апісаннем правядзення і вынікамі папярэдніх сходаў з 1996 па 2016 год.

Распрацоўшчыкі прадугледзелі і інтэрактыўны складнік сайта: у раздзеле «Зваротная сувязь» можна атрымаць поўную інфармацыю пра час работы і адрасы грамадскіх прыёмных у кожнай вобласці, а таксама адправіць уласную прапанову на тэму, якая цікавіць. Для гэтага трэба выбраць свой рэгіён і запоўніць адпаведную форму заяўкі.

Актуальна

Падтрымка сямейных работнікаў, паслугі па доглядзе малых, дапамога шматдзетным

Ірына КАСЦЕВІЧ анансавала сацыяльныя новаўвядзенні

Пачынаючы з 2021 года будуць пашыраны меры сацыяльнай абароны, у прыватнасці падтрымка сем'яў з дзецьмі, а таксама паслугі па доглядзе малых ранняга ўзросту, з'явяцца новыя сацыяльныя паслугі для сем'яў з дзецьмі-інвалідамі і іншае. Пра гэта расказала міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч, наведваючы Баранавічы.

— У сямейнай палітыцы мы арыентуемся на забеспячэнне сацыяльных паслуг. У нас у двух гарадах працуюць сацыяльныя цэнтры па аказанні паслуг сем'ям з дзецьмі. Задача наступнай пяцігодкі — каб яны ствараліся і развіваліся ў кожным абласным цэнтры. Таксама трэба развіваць паслугі па доглядзе дзяцей ранняга ўзросту. Прыцягваць у гэтую сферу не толькі дзяржаву, але і прыватны бізнес, які зможа прадаваць паслугі за адэкватную, даступную цану, — адзначыла Ірына Касцевіч.

Міністр звярнула ўвагу на тое, што ў наступным годзе Мінпрацы пашырыць пералік бясплатных сацыяльных паслуг для сем'яў з дзецьмі-інвалідамі. Вырашана пытанне па дадатковай выплаце шматдзетным сем'ям адраснай сацыяльнай дапамогі ў сувязі са зніжэннем прыбыткаў пры нараджэнні дзіцяці.

— З верасня гэтага года павышаны крытэрый патрэбнасці для штомесячнай сацыяльнай дапамогі са 100 % да 115 % БПМ. Верагодна, не з 2021, а з 2022 распаўсюдзім гэтую меру і на сем'і, якія выхоўваюць дваіх дзяцей. Таму што тут таксама ёсць праблема, — патлумачыла міністр. Яна дадала, што з Міністэрствам адукацыі плануецца прапрацаваць магчымасць вызвалення ад аплаты за навучанне аднаго з бацькоў пры нараджэнні дзіцяці ў студэнцкай сям'і.

Ірына Касцевіч закранула пытанне фарміравання ў наймальнікаў прыязнага стаўлення да работнікаў, у якіх ёсць сямейныя абавязкі.

— Нам трэба пераарыентаваць працадаўцу. Ён мусіць усведамляць, што работнік з сямейнымі абавязкамі — дысцыплінаваны, адказны, каштоўны кадр. У пяцігодцы разгорнем канцэпцыю, сяброўскую бацькам. Будзем нацэльваць працадаўцаў распрацоўваць пакеты, накіраваныя на падтрымку сямейных работнікаў, — дадала яна.

Ірына Касцевіч паведаміла, што ў апошнія гады ў Беларусі вырасла колькасць шматдзетных сем'яў. Звязваюць гэта ў тым ліку і з праграмай сямейнага капіталу, якая стартавала ў 2015 годзе. З таго моманту колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася на 40 %. Цяпер іх у краіне 112 тысяч, больш за ўсё ў Брэсцкай вобласці.

— Мы прааналізавалі, што сямейны капітал працуе эфектыўна. У сярэднім штогод нараджаецца 20-22 тысячы трэціх і наступных дзяцей. Было прынята рашэнне аб падаўжэнні гэтай праграмы, — адзначыла Ірына Касцевіч. — З 1 студзеня 2020 года яна запрацавала ў абноўленым варыянце, было прадугледжана датэрміновае выкарыстанне сямейнага капіталу. Мы ацанілі, як гэта спрацавала. Датэрмінова сямейным капіталам скарысталіся амаль 27 тысяч сем'яў. Каля 90 % патрацілі гэтыя сродкі на жыллё, — праінфармавала міністр.

Алена КРАВЕЦ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Еўрапейскія краіны пачалі масавую вакцынацыю

Як паведаміла старшыня Еўрапейскай камісіі Урсула фон дэр Ляен, вакцына Pfizer-BioNTech была дастаўлена ва ўсе 27 краін Еўрасаюза. Першымі ў Італіі былі прышчэплены ўрачы, якія працуюць з хворымі на COVID-19, а на Кіпры — медыкі дома састарэлых. У Венгрыі вакцыну атрымаў урач цэнтральнай бальніцы Дэль-Пешта. Улады Славакіі таксама абвясцілі аб пачатку прышчэпачнай кампаніі. Пачалася вакцынацыя ў Францыі, адпаведная кампанія стартавала ў Іспаніі і Балгарыі. У Бельгіі і Люксембургу распачалі вакцынацыю 28 снежня, у Нідэрландах, як чакаецца, яна стартуе з 8 студзеня. Усюды выкарыстоўваецца прэпарат Pfizer і BioNTech, ухвалены Еўракамісіяй пасля станоўчых рэкамендацый з боку Еўрапейскага агенцтва лекавых сродкаў (EMA). У той жа час урад Аргенціны абвясціў аб пачатку кампаніі вакцынацыі насельніцтва з ужываннем расійскага прэпарату «Спадарожнік V».

Кітай знізіў узрост крымінальнай адказнасці да 12 гадоў

Аб гэтым паведаміла інфармагенцтва Associated Press. У мэтах барацьбы з дзіцячай злачыннасцю гэты ўзрост панізілі з 14 да 12 гадоў. Цяпер дзеці з 12 да 14 гадоў могуць несці крымінальную адказнасць за наўмыснае забойства, за наўмыснае нанясенне цялесных пашкоджанняў, якія прывялі да смерці, а таксама за прычыненне цяжкіх траўмаў з асаблівай жорсткасцю. За іншыя злачынствы дзяцей могуць адправіць у карэкцыйную ўстанову. Прынятая папраўка атрымае сілу 1 сакавіка. На дадзены момант у Кітаі крымінальная адказнасць наступае ў 16 гадоў, а падлеткі ад 14 да 16 гадоў могуць несці крымінальнае пакаранне за наўмыснае забойства, згвалтаванне і рабаванне. Раней у КНР малалетнія злачынцы атрымлівалі адносна мяккае пакаранне, што выклікала абурэнне грамадзян. Так, напрыклад, 13-гадовы хлопчык атрымаў усяго тры гады ў карэкцыйнай установе за забойства 10-гадовай дзяўчынкі.

Археолагі адшукалі ў Пампеях «энергетычны батончык»

Даследчыкі выявілі аналаг сучаснага энергетычнага батончыка ў адным з раёнаў старажытнага горада Пампеі, паведаміў тэлеканал CBS News. Яго адшукалі ў раёне, які часткова раскапалі толькі ў мінулым годзе. «Батончык» ляжаў на прылаўку тэрмаполія (карчмы — **рэд.**), якая выходзіла на вуліцу. У адпаведных старажытнарымскіх установах гандлявалі гарачай ежай і віном. Як вядома, Пампеі загінулі падчас вывяржэння вулкана Везувій у 79 годзе нашай эры. Яны знаходзяцца ў Італіі, якая тады была часткай Рымскай імперыі.

ЯЎГЕН СТАЎ ТЫСЯЧНЫМ

У Лідзе зарэгістравалі тысячнага ў гэтым годзе нованароджанага

www.lidanews.by

ХЛОПЧЫК нарадзіўся ў сям'і маладых лідчан Веры і Максіма ЗВЯРКО. Ён стаў тысячным нованароджаным з тых, хто з'явіўся на свет сёлета. Цікава, што і сам бацька Максім у 1989 годзе таксама меў такі ж самы круглы нумар пры нараджэнні ў сям'і ваеннаслужачага.

Шчаслівыя бацькі ўжо зарэгістравалі свайго першынца. Як расказала «Лідскай газеце» **начальнік аддзела ЗАГС Лідскага райвыканкама Іна БЯНКЕВІЧ,** адпаведны запіс зроблены ў кнізе актаў рэгістрацыі пад нумарам 1000. Бацькам уручана пасведчанне аб нараджэнні ва ўрачыстай абстаноўцы.

Хлопчыка бацькі вырашылі назваць Яўгенам. Ён нарадзіўся з вагой 3 кілаграмы 840 грам і ростам 54 сантыметры. Нараджэнне новага члена сям'і стала для Максіма і Веры новым этапам іх сямейнага жыцця.

— Гэта для нас не толькі вялікая радасць, але і адказнасць, — кажуць маладыя бацькі. — Дзякуючы нараджэнню дзіцяці, адкрылася новая старонка нашага сумеснага жыцця, можна сказаць, што ў нас цяпер сапраўдная сям'я. Мы дапамагаем адно аднаму, падтрымліваем ва ўсім. У адносінах з'явілася больш павагі, даверу і клопату. Цяпер ад нас залежыць, якім вырасце наш сын, кім ён стане ў будучыні.

Апошнія тры гады адзначаць нараджэнне тысячнага дзіцяці стала ў Лідзе добрай традыцыяй. Як правіла, гэта падзея прыпадае менавіта на снежань.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

Добрая навіна

АБНОЎЛЕНАЕ ПАШТОВАЕ АДДЗЯЛЕННЕ АДКРЫЛАСЯ Ў МІНСКУ

Жыхары сталічнага мікрараёна Усход-1 атрымалі да навагодніх і калядных свят добры падарунак. Адкрылася абноўленае аддзяленне паштовай сувязі Мінск-114. Працавала яно з 1978 года ў адным са знакамітых дамоў з пано, якія знаходзяцца насупраць Нацыянальнай бібліятэкі. За 40 з лішнім гадоў наспеў час «перазапуску» аддзялення. Ды і сам жылы дом, у якім яно месціцца, знакавы. Ён з'яўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

Цяпер да паслуг наведвальнікаў у аддзяленні — пяць аперацыйных вокнаў. Але зусім не заўсёды абавязкова выбіваць асобны талон у сістэме электроннай чаргі, каб зрабіць пэўнае дзеянне. У плацежна-даведачным тэрмінале можна здзейсніць усе неабходныя плацяжы без камісіі. Таксама тут працуе спецыяльны тэрмінал SmartPost. Ён прызначаны для адпраўкі заказной пісьмовай карэспандэнцыі вагой да двух кілаграмаў па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Трафік у аддзяленні чакаецца істотны — у ім абслугоўваецца каля 30 тысяч людзей, якія жывуць у суседніх дамах, і каля 400 арганізацый. У месяц у сярэднім прымаецца каля васьмі тысяч экзэмпляраў пісьмовай карэспандэнцыі, 550 пасылак і 230 адпраўленняў паскоранай пошты.

— Сёння па краіне працуе больш за тры тысячы паштовых аддзяленняў. На долю Мінска прыходзіцца крыху больш за 140. Наша мэта — паступова абнавіць усе нашы аддзяленні ў Беларусі, — адзначыла **генеральны дырэктар РУП «Белпошта» Святлана ЮРКЕВІЧ.** — Зразумела, што адразу гэта не атрымаецца. Штогод плануем асучасніваць каля 70 аддзяленняў. У адзін дзень з Мінскам урачыстыя адкрыцці адбыліся таксама ў Віцебску і ў Мазыры. Пры рамонце ж гэтага аддзялення мы пастараліся стварыць безбар'ернае асяроддзе. Паклалі тактыльную плітку, зрабілі зручныя дзверы, а таксама ўсталявалі кнопку выкліку персаналу, які пры неабходнасці дапаможа патрапіць у памяшканне.

Таксама тут размясціўся спецыялізаваны дзіцячы куток. Калі бацькі афармляюць у аперацыйным акне нейкія дакументы ці проста стаяць у чарзе, дзеці могуць правесці час з карысцю для сябе — размалёўваючы спецыяльныя карцінкі на паштовую тэматыку.

Начальнік аддзялення сувязі Мінск-114 Вольга РЭУТ адзначыла, што цяпер можна запісацца ў электронную чаргу. Гэты функцыянал рэалізаваны пры дапамозе сайта «Белпошты». Ацанілі абноўленае аддзяленне і мясцовыя жыхары.

— Усё зрабілі літаральна за два месяцы, — кажа адна з наведвальніц, Людміла Пятроўна, якая прыйшла атрымаць ліст да запатрабавання. — Вельмі падабаецца ўсё. Я жыву ў гэтым жа доме з моманту яго засялення, і ніколі не думала, што такое харство прыйдзе і да нас. Канешне, ранейшы знешні выгляд быў, пэўна, актуальны для той эпохі, калі будаваўся дом, але з таго часу шмат чаго ўжо змянілася. Ды і чэргаў, пэўна, стане менш.

Валяр'ян ШКЛЕННІК, фота аўтара.

У Свіслачы здалі ў эксплуатацыю шматпавярховік: ключы атрымалі 37 шматдзетных сем'яў

Днямі быў афіцыйна здадзены ў эксплуатацыю сяміпавярховы 56-кватэрны дом, у якім свае ўласныя «квадраты» цяпер маюць 37 шматдзетных сем'яў, астатнія — з ліку тых, хто меў патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Як расказаў **старшыня Свіслацкага райвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ,** для будаўніцтва жылля сем'і прыцягвалі крэдытныя рэсурсы агульным коштам каля 3,2 мільёна рублёў. Шматдзетныя сем'і будаваліся на ўмовах дзяржпадтрымкі: згодна з Указам № 240 сем'ям з трыма дзецьмі гэты крэдыт будзе пагашаны судсідыяй дзяржавы ў памеры 95 %, з чатырма — на ўсе 100 %. Таксама 16 шматдзетных сем'яў рэалізавалі сваё права на датэрміновае выкарыстанне мацярынскага капіталу для таго, каб цалкам аплаціць кошт сваіх кватэр.

Суразмоўнік таксама дадаў, што навасёлле адзначаць і восем грамадзян, якія атрымаюць кватэры ў якасці сацыяльнага жылля. Некалькі кватэр стануць арэнднымі.

Пабудовай шматпавярховіка займалася ААТ «Гроднажылбуд», якое справілася з задачай хутка — усяго за паўгода.

Аляксандр Вярсоцкі падкрэсліў, што заданне па будаўніцтве жылля на 2020 год раёнам выканана, ёсць планы па ўводзе жылля і на наступны — у прыватнасці, акцэнт у 2021-м зробяць на індывідуальным будаўніцтве. Плануецца распрацоўка праекта сядзібнай забудовы з інжынернымі сеткамі ў раёне вуліцы Гагарына ў райцэнтры.

Між іншым, рэалізацыя штогадовых планаў па будаўніцтве становіцца сур'ёзным штуршком да скарачэння адпаведнай чаргі. Па яго словах, цяпер на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, знаходзіцца 561 чалавек, 82 з іх — са статусам шматдзетных.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Слова — чытачам

«Звязда» — наш культурны здабытак

Андрэй БУГРОЎ, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў:

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

— Я люблю чытаць газеты. Так, сапраўды, у наш век камп'ютарных тэхналогій з асалодай чытаю друкаваныя выданні. «Звязда» — адна з тых газет, якая заўсёды на стале ў старшыні Савета дэпутатаў сталіцы. Чаму? Кажу шчыра: «Звязда» — граматнае прафесійнае выданне, якое заўсёды цікава адкрываць. Хочацца таксама адзначыць, што кожны нумар газеты прадуманы, насычаны публікацыямі рознай тэматыкі, якія цікавыя як моладзі, так і людзям любога іншага ўзросту.

Назаву асобныя перавагі выдання.

Па-першае, «Звязда» — дзяржаўная рэспубліканская газета на беларускай мове.

Па-другое, у газеце працуюць адметныя журналісты. А калі артыкул піша асоба, індывідуальнасць, то заўсёды цікава чытаць такі матэрыял.

Па-трэцяе, люблю «Звязду» за тое, што яна заўсёды інфармавана ў пытаннях мясцовага кіравання і самакіравання ў нашай краіне. Як дэпутат люблю чытаць публікацыі пра людзей, іх лёсы, штодзённае жыццё.

І, па-чацвёртае, «Звязда» — проста добрая газета, вельмі добрая. З упэўненасцю магу сказаць: «Звязда» — наш культурны здабытак.

У наш час інавацыйных тэхналогій хацелася б, каб «Звязду» чытала як мага больш жыхароў нашай краіны. А матэрыялы на яе старонках заставаліся такія ж разнапланавыя, здымкі — каляровыя і прыгожыя, а інфармацыя — аператыўная, дакладная, змястоўная і карысная.

Надвор'е

НЕ ЗУСІМ СВЯТОЧНЫ ДОЖДЖЫК...

Трэці год запар апошнія дні снежня атрымліваюцца ў нас на здзіўленне цёплымі. Ды і гэты сезон не стаў выключэннем. Дождж, мокры снег, галалёд, уначы — слабы мінус, удзень — месцамі ўпэўнены плюс. Вось яно — беларускае надвор'е ў апошні тыдзень года. Пра гэта нам расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

Сёння пад уплывам атмасферных франтоў з паўднёвага захаду Еўропы прыйдзе воблачнае надвор'е. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. На асобных участках дарог прагназуецца галалёдзіца. Захаваецца моцны парывісты вецер. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе ад нуля да плюс 5 градусаў, па захадзе — да 8 цяпла.

У сераду ў нас таксама будзе воблачна з праясненнямі. Месцамі пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным дождж. Уначы і раніцай чакаюцца слабы туман, галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца. Вецер будзе паўднёвы, паўднёва-ўсходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла, удзень — 1—6 цяпла, па поўдні краіны — да плюс 8 градусаў.

У перадсвяточны дзень, 31 снежня, чакаецца «мокрае» і воблачнае надвор'е. Часам пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і дажджу з мокрым снегам. Уначы і раніцай месцамі прагназуюцца слабы туман, галалёд, на асобных участках дарог — галалёдзіца. Вецер паўднёвы, паўднёва-ўсходні ўмераны. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 градуса да плюс 6. Удзень будзе 2—8 цяпла.

Першая пятніца 2021-га будзе шэрая і дажджлівая. Тэмпература паветра на працягу сутак 1 студзеня будзе знаходзіцца ў межах ад мінус 1 градуса па паўночным захадзе да плюс 6 градусаў па паўднёвым усходзе краіны. На большай частцы тэрыторыі пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. У асобных раёнах чакаюцца туман, слабы галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Святочным гэтае надвор'е не назавеш... Але ж настрой залежыць не ад надвор'я.

Сяргей КУРКАЧ.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю намесніка міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь КРАЎЧАНКІ Алега Іванавіча і выказвае глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь перадае глыбокія спачуванні родным і блізкім у сувязі са смерцю Алега Іванавіча КРАЎЧАНКІ, намесніка міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Злучаных Штатах Амерыкі. Шчыра падзяляем ваш смутак і выказваем словы спачування.

«ВІРУС КІЕМ АДГАНЯЮ»

ДОЧКІ ПРЫЕДУЦЬ

Вольга ГРЫЦУК жыве ў вёсцы Манцы Пружанскага раёна. 88-гадовая Вольга Максімаўна — энергічная, рухавая, працавітая, усмешлівая жанчына. У свой час за работу ў калгасе атрымала ордэн «Знак Пашаны». Са сталых жыхароў іх маляўнічай вёскі на ўскрайку пушчы засталіся два чалавекі — яна і суседка Валянціна, ёсць некалькі дачнікаў. Аўдавела Вольга Максімаўна некалькі гадоў таму і жыве адна. Але ж бабуля яна багатая — мае пяць унукаў і 12 праўнукаў. Адна дачка жыве ў суседняй вёсцы, другая — у горадзе.

— Дочкі, вядома, прыедуць, — гаворыць Вольга Максімаўна, — яны і цяпер заязджаюць. А сама з пачатку другой хвалі эпідэміі нікуды не выходжу, нават у царкву рашыла на гэты час не ездзіць. Па ўзросце я ж у першай групе рызыкі, таму палічыла неабходным прыняць усе меры засцярогі. Хату да свята я самастойна падрыхтавала. Дачка прыехала і здзівілася: «Вой, у цябе поўны парадак!» Ну а што, я парадак люблю, і паціху самастойна яго навяла. Працаваць з дзяцінства прывучаная, пакуль сілы дазваляюць, раблю па доме і на прысядзібным участку, курачак трымаю. Вунь сусед мой прыедзе, дачнік Барыс, яек яму занясу, пачастую. Ён нам таксама ва ўсім дапамагае.

Раней мае ўнучкі, праўнучкі з Мінска прыязджалі, — працягвае пенсіянерка. — Весялосць у хаце, радасць. А цяпер хіба па мабільніку пазвоняць і павіншуюць. Не хочуць рызыкаваць маім здароўем, вось і не едуць. Буду святкаваць Новы год адна ў спадзяванні, што налета ўсё будзе інакш, ну а на Каляды, вядома, дачка з зяцем прыедуць. Толькі б усе былі здаровыя.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Мікалай КАПАНЬКА.

УДВАІХ — ДОБРА

У вёсцы Зеляніца Маларыцкага раёна жывуць працавітыя сужэнцы Надзея і Мікалай КАПАНЬКІ. Былы калгасны шафёр у свае 83 гады водзіць уласны аўтамабіль і не мае праблемы, калі трэба пад'ехаць па справах у горад ці ў сельскі Савет. Вось і падчас нашага наведвання пашкадаваў, што няма дома гаспадыні, бо напярэдадні завёз яе ў бальніцу ў Олтуш на планавае лячэнне.

Але хораша расказаў пра вёску, пра сваю сям'ю. Бацька Мікалая Міхайлавіча загінуў на вайне, а маці паднімала трох малых адна. А вось цяпер яны на пенсіі з Надзеяй Васілеўнай ні дня не сядзяць без справы, зрабілі свой падворак, можна сказаць, узорным: вырошчваюць мноства кветак, што цвітуць з вясны да позняй восені. Дарэчы, абодва за работу ў калгасе маюць дзяржаўныя ўзнагароды, а сёлета адзначылі 60-годдзе сумеснага жыцця.

На гэты раз пагаварыць удалося з гаспадыняй. Надзея Капанька сказала:

— Хутчэй за ўсё, будзем святкаваць удваіх. Самі ведаеце, з якой прычыны цяпер дзеці і ўнукі не часта праведваюць. У нас усё ёсць, аўтакрама два разы на тыдзень, пошта прыязджае да нас. Ды і сам муж можа ў магазін падскочыць, калі спатрэбіцца што купіць. Так што стол прыгатую: і сабе, і катам хопіць. Гадуем тут цэлую каціную ферму, — засмяялася суразмоўніца. — Так ужо выйшла. Хата нашая стаіць на рагу вёскі, пры самай дарозе. Вось некаторыя гараджане едуць у лес у грыбы ды і выпусцяць з машыны кацяня, якое іхнім дзецям надакучыла. І не вытрымліваем, каб не пакарміць такога няшчаснага катка. Раз пакорміш, ён і застанецца. Вось так ужо шэсць катоў і назбіралася.

ЗА ПАРОМНАЙ ПЕРАПРАВАЙ

Зоя АЛЕХНІК у Драгічынскім раёне жыве не проста ў маленькай вёсцы, але ў вёсцы за паромнай пераправай. Зоя Андрэеўна расказвала гісторыю, якая ўжо стала амаль вясковай легендай, як у іх збіраліся пабудаваць мост, каб звязаць вёску з «вялікай зямлёй» ды... перадумалі. Тады Навасёлкаўскі рыбгас быў эканамічна моцнай гаспадаркай, узводзілі нават жыллё для яго работнікаў. Але тагачасныя кіраўнікі чамусьці адмовіліся ад ідэі ўзвесці мост цераз раку, бо баяліся, што стане шмат ахвотных красці рыбу. У выніку мост не зрабілі, рыбгас паціху стаў страчваць былыя пазіцыі, і вёска пачала згасаць. Цяпер зносіны з усім навакольным светам Навасёлкі ажыццяўляюць з дапамогай паромнай пераправы. У вёсцы засталося некалькі пенсіянераў ды дзве сям'і працаздольных людзей. Пра сябе Зоя Андрэеўна сказала, што багатая на ўсю акругу: мае пяць дачок, пяць зяцёў, дзевяць унукаў, адзінаццаць праўнукаў.

— Прывыкла ўжо тут, за паромам, — разважае 80-гадовая жыхарка Навасёлак. — Аўтакрама да нас тры разы на тыдзень ходзіць. Праўда, зараз прадавец памянялася. А ранейшая, Рая, была нам як родная. Прывязе не толькі прадукты, якія толькі пажадаем, але і ў аптэку сходзіць, лекі купіць, калі што па гаспадарцы трэба, у гаспадарчы магазін забяжыць. Спадзяёмся, што і новая супрацоўніца будзе такая. Адным словам, да свята ёсць дзе купіць. Мая галоўная праблема — здароўе, ногі баляць, хаджу з цяжкасцю. Але ж на свята адна не буду. Побач жыве дачка з зяцем. З імі будзем адзначаць. У іх два дарослыя сыны. Ужо ВНУ скончылі, працуюць. Хлопцы выраслі працавітыя, шкодных звычак не маюць, усе выхадныя ў вёску едуць, каб бацькам дапамагчы. Так што ёсць нагода парадавацца, што добрыя дзеці, унукі, праўнукі выраслі, а гэта і ёсць свята для мяне.

Зоя АЛЕХНІК.

УНУЧКА З ІТАЛІІ ПАЗВАНІЛА

Марыя Іванаўна Дзямчук жыве ў аддаленай вёсцы Маларыцкага раёна з цікавай назвай Ацяты. Яна расказала легенду пра назву, якая тут перадаецца з пакалення ў пакаленне. Казалі, што мясцовы пан, які жыў у Арэхаве, высылаў сюды асабліва свабодалюбівых, непакорных жыхароў. Па-руску Отяты значыць «оттятый, отрезанный». І праўда, некалькі сем'яў нібы адрэзалі ад свету, пасяленне ўтварылася ў лесе ў балоцістай мясцовасці, аддзеленае ад дарог. У іх нават пры савецкай уладзе ў апошніх правялі святло, у апошніх з'явілася радыё. Лясное месцазнаходжанне вёскі стала горам падчас акупацыі. За сувязь з партызанамі расстралялі 20 жыхароў.

Цяпер ёсць добрая дарога, рэгулярна прыходзіць аўтакрама, а вось жыхароў засталося зусім мала. Марыя Іванаўна жыве адна. Сям'я ў яе цудоўная, усе прыязджаюць, клапоцяцца, тэлефануюць.

— Звоняць мне кожны дзень: як ты там жывеш? І ўнучка з Італіі пазваніла. Кажу, жыву яшчэ, вірус той

Марыя ДЗЯМЧУК.

кіем адганяю. Вось бачыце, якая навала на людзей прыйшла, — бядуе суразмоўніца. — Мае ўсе захварэлі: і ў Брэсце, і ў Мінску. Забараніла ўсім прыязджаць. Нават тым, хто папраўіўся. Я тут перасяджу адна, паспеем убачыцца, пагаварыць. Галоўнае, каб усе былі здаровыя. Летам маё 80-годдзе спраўлялі, усе-усе сабраліся, толькі ўнучка з Італіі не прыехала, хоць збіралася. Але ж з-за гэтай пандэміі давялося планы памяняць. Цяпер вышываю ды малюся. Прашу ў Бога здароўя для родных і блізкіх, для ўсіх людзей. Няхай гэта немач сыдзе ад нас, каб мы ўсе не баяліся сустракацца, святкаваць вялікімі кампаніямі, каб усе, хто захварэў, паправіліся. Гэта цяпер самае галоўнае.

Святлана ЯСКЕВІЧ, фота аўтара.

З нагоды

Ёлачныя фантазіі

У Гродне зазіхацела алея дызайнерскіх ёлак

Навагоднія інсталяцыі вось ужо некалькі гадоў прадстаўляюць прадпрыемствы і ўстановы горада. Алея крэатыўных ёлак раскінулася ў парку імя Жылібера. Гэта казачнае відовішча асабліва захапляе вячэрнім часам, калі ёлкі зіхацяць каляровымі агеньчыкамі.

Сёлета тут установлена каля паўсотні аўтарскіх прыгажунь. Кожная з іх адлюстроўвае спецыфіку таго ці іншага прадпрыемства. У справу ідуць самыя незвычайныя прадметы. Можна ўбачыць ёлку з бутэлек ад шампанскага. Уражваюць канструкцыі з будаўнічых блокаў, пластыліну, металічных і драўляных элементаў. Упрыгожваннем разам з ёлачнымі шарамі і шышкамі сталі вінілавыя пласцінкі. Не абышлося і без сімвала 2021 года Быка. Аказваецца, гэты вобраз можна стварыць нават з аўтамабільных фільтраў.

Дызайнерская алея будзе радаваць гараджан і гасцей горада амаль месяц. Па выніках конкурсу журы вызначыць тройку пераможцаў. Сёлета ёсць магчымасць паўдзельнічаць у анлайн-галасаванні усім жадаючым. Такім чынам будзе абрана ёлка, якой дастанецца прыз сімпатый гледачоў.

Святочныя мерапрыемствы ахопяць Савецкую плошчу горада. Менавіта яна стане эпіцэнтрам навагодняга свята. Сёлета фармат мерапрыемства змяніўся, тут упершыню вырашана правесці еўрапейскі калядны кірмаш. Будзе працаваць некалькі зон: фудкорт, ёлачны базар, зона рамеснікаў, фотазона і канцэртная пляцоўка, дзе выступяць гродзенскія артысты і калектывы. Дарэчы, маштабны кірмаш «Зімні фэст» пачаў сваю работу, а з 18 снежня ў Цэнтры рамёстваў «Спадчына» адчынена гарадская сядзіба Дзеда Мароза.

Маргарыта УШКЕВІЧ. Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Жыць і працаваць па-новаму...

ДАМАШНІ ЎНІВЕРСІТЭТ

— Мы зрабілі ўсё неабходнае, каб пажылыя грамадзяне не адчувалі сябе забытымі, незапатрабаванымі. З гэтай мэтай укараняем новыя формы работы. Апраўдала сябе, у прыватнасці, такая дыстанцыйная форма, як «Дамашні ўніверсітэт», — кажа **дырэктар установы Святлана МАЛІНОЎСКАЯ.**

— У нашым аддзяленні налічваецца 59 чалавек, у тым ліку 6 мужчын. Узрост наведвальнікаў ад 60 да 86 гадоў. Тут функцыянуюць чатыры гурткі і сем клубаў па інтарэсах, тры школы. У сувязі з санітарна-эпідэміялагічнай абстаноўкай мы адкрылі школу дыстанцыйнага навучання «Дамашні ўніверсітэт». А пачыналі з таго, што спачатку пагутарылі з кожным, хто жадае сюды запісацца. У выніку далі згоду 30 чалавек. Кожнаму з іх мы накіравалі пісьмовае паведамленне, што ён залічаны ў школу. У гэтым дакуменце прапісаны ўсе этапы, кірункі, па якіх будзем працаваць. Гэта — гісторыя Капыля і раёна, лекавыя расліны, здаровы спосаб жыцця, — расказвае **загадчыца аддзялення забеспячэння дзённага пражывання пажылых грамадзян тэрытарыяльнага цэнтра Валянціна НІКАЛАЕНЯ.**

Навучэнцы праходзяць выпрабаванне на веданне гісторыі рэгіёна, сваёй малой радзімы. Напачатку работнікі цэнтра раздалі ім неабходную інфармацыю па тэме і тэсты да яе з пытаннямі, на якія трэба адказаць. Першы этап стартаваў 6 лістапада і завершыцца 22 снежня. Затым удзельнікам школы ўручаць сертыфікаты аб заканчэнні школы дыстанцыйнага навучання, а пераможцаў чакае ўзнагароджанне. Разам з тым супрацоўнікі ТЦСАН правялі апытанне сярод пажылых людзей, ці падабаецца ім займацца ў дыстанцыйнай школе, якія тэмы, на іх думку, варта ўнесці ў далейшы курс навучання. І атрымалі шмат прапаноў.

Дадам, што з дапамогай сацыяльнай пошты забяспечваюцца ўсе меры засцярогі ад заражэння ковідам, як сярод пажылых, так і работнікаў. Спецыялісты разносяць паведамленні па паштовых скрынях, дзе жывуць адрасаты.

— Кожная тэма прадугледжвае дзесяць пытанняў. За правільны адказ налічваецца адзін бал. На наступным тыдні будзе ўручэнне сертыфікатаў. Акрамя таго, дзякуючы спонсарам кожны з удзельнікаў атрымае аднаразовыя маскі і пальчаткі, — тлумачыць Валянціна Іосіфаўна.

Тым часам заглядваю ў сшытак з адзнакамі «студэнтаў».

— Дык у вас адны выдатнікі! Як жа вызначыць пераможцаў? — здзіўляюся.

— Справа ў тым, што ўсе вельмі адказна падышлі да справы, — падтрымала размову **спецыяліст па сацыяльнай рабоце Ала ГРЫГАРЭВІЧ.** — Спачатку запісвалі адказы ў апытальніку алоўкам і чакалі прыезду дзяцей, каб упэўніцца, што ўсё зрабілі правільна. І толькі тады контуры літар абводзілі ручкай. — Нашы падапечныя прынялі вельмі актыўны ўдзел у дыстанцыйнай школе. Напрыклад, адна 84-гадовая жанчына тэлефануе паведаміць, што выканала заданне, маўляў, забярыце. А ёй толькі ўчора яго прынеслі. У пятніцу з нецярпеннем яны чакаюць каля акна, бо ведаюць, што ў гэты дзень у вызначаны час прыйдуць нашы супрацоўнікі з чарговым заданнем.

— Што дае гэтая праграма для састарэлых? — цікаўлюся ў суразмоўнікаў.

— Гэта магчымасць заняць сябе падчас пандэміі. Не на апошнім месцы тут і фарміраванне здаровага спосабу жыцця, актыўнага даўгалецця. Акрамя таго, яны чэрпаюць для сябе новыя веды, карысную інфармацыю. Напрыклад, возьмем лекавыя травы. Мы даём ім звесткі, якімі ўласцівасцямі валодае кожная зёлка, якую карысць і нават шкоду прыносіць арганізму. Здаровы спосаб жыцця ўключае шмат момантаў — здаровы сон, якаснае і правільнае харчаванне, актыўная дзейнасць.

НЕ СТРАЦІЛІ СУВЯЗІ З ПАЖЫЛЫМІ

— Пандэмія каранавіруса не перашкодзіла рабоце з пажылымі грамадзянамі, мы не страцілі з імі сувязі, — запэўніла Святлана Маліноўская. — У гэтым аддзяленні людзі знаходзяцца пад асаблівым патранатам, кантролем і ўвагай. Спецыялісты тэлефануюць ім кожны дзень, цікавяцца станам іх здароўя, што ім патрэбна. Дарэчы, у цэнтры арганізавана «гарачая» тэлефонная лінія, выконваем заяўкі па ўсім раёне, дастаўляем лекі, прадукты харчавання, прадметы першай неабходнасці, санітарна-гігіенічныя сродкі.

Падчас першай хвалі каранавіруса ў нашых падапечных была паніка, яны адмаўляліся наведваць заняткі, гурткі, прызнаецца Святлана Станіславаўна. Цяпер, дзякуючы адукацыйнай праграме, людзі разумеюць, што ў прынцыпе жыццё не спынілася, працягваецца, што ўрачы ведаюць, як змагацца з новай хваробай. Але мы пастаянна ім нагадваем, што перш за ўсё неабходна захоўваць меры засцярогі. Ні адзін пажылы чалавек нават да ўвядзення абавязковага масачнага рэжыму не выходзіў на вуліцу без рэспіратара.

У цёплую пару года работнікі цэнтра практыкавалі мерапрыемствы на вуліцы. Напрыклад, разам з супрацоўнікамі мясцовага музея праводзілі экскурсіі па вуліцах горада для аднаго-двух чалавек. Ім расказвалі аб гісторыі ўзнікнення канкрэтнай вуліцы, у гонар каго яна названая, якія гістарычныя падзеі тут адбываліся, якія помнікі гісторыі і архітэктуры тут знаходзяцца. Нават калі эпідэміялагічная сітуацыя не зменіцца, такую практыку плануюць працягваць, а дыстанцыйнае навучанне пяройдзе ў іншую форму.

САЦЫЯЛЬНЫ РАБОТНІК — КРЫХУ ПСІХОЛАГ

— У аддзяленні сацыяльнай дапамогі дома налічваецца 116 сацыяльных работнікаў, якія ахопліваюць паслугамі 1104 пажылых грамадзян. Работа сацыяльных работнікаў падчас пандэміі, зрэшты, не памянялася. Яны наведваюць сваіх падапечных, дапамагаюць ім з дамашнімі клопатамі, гатуюць ежу, прыносяць лекі, прадукты харчавання, бытавыя тавары. Ёсць пытанні, якія не ўваходзяць у іх абавязкі. Напрыклад, як нешта адрамантаваць у хаце, перакрыць дах. У гэтым выпадку яны садзейнічаюць у падборы неабходнага спецыяліста.

— У нас ёсць чатыры сацыяльныя пункты ў чатырох вёсках раёна. Тут працуюць інспектары, якія кантралююць работу сацыяльных работнікаў на ведамаснай тэрыторыі і забяспечваюць даступнасць аказання паслуг. Калі ўзнікаюць складаныя, экстранныя сітуацыі, нам не трэба туды ехаць, усе пытанні вырашыць інспектар, — адзначае **загадчыца аддзялення сацыяльнай дапамогі дома Вольга САКОВІЧ.** — У Грозаве сфарміравана пэўная сістэма сацыяльнай абароны. Акрамя сацыяльнага пункта, у 2017 годзе адкрыты дом сумеснага пражывання для пажылых грамадзян, разлічаны на шэсць чалавек. Пры крытычнай сітуацыі тут можам размясціць да 11 чалавек. Штодня сюды прыходзіць сацыяльны работнік, прыбірае, гатуе.

Усе сацработнікі забяспечаны веласіпедамі, сродкамі індывідуальнай аховы, вытрымліваюць рэжым змены масак, кожны разумее, што не мае права падвяргаць рызыцы здароўе састарэлых людзей.

Сацыяльныя работнікі заўсёды былі крыху псіхолагамі, тым больш цяпер. Яны рэгулярна праводзяць гутаркі з пажылымі, якія знаходзяцца на абслугоўванні, наконт захавання правіл бяспекі, нашэння масак і пальчатак, калі выходзяць на вуліцу і нават калі прыязджаюць дзеці. Просяць нагадваць пра гэта і дзецям, і ўнукам. Акрамя таго, яны супакойваюць людзей, каб у іх не ўзнікалі дэпрэсія, панічны настрой. Тлумачаць, што ў іх ёсць надзейныя памочнікі, што з любой сітуацыі яны дапамогуць знайсці выхад. Сацыяльныя работнікі выконваюць не толькі заяўкі тых, хто стаіць на абслугоўванні ў цэнтры. Тэлефануюць ім усе, каму патрэбна дапамога, і яны нікому не адмаўляюць. Напрыклад, званок аднаго з грамадзян быў як крык душы, маўляў, усе дамашнія захварэлі, няма каму прынесці прадукты харчавання.

— Мы нікога не пакінулі сам-насам са сваімі праблемамі, — кажа Святлана Станіславаўна. У нас не ўзнікаюць пытанні, як паступіць у той ці іншай сітуацыі, прапрацаваны ўсе маршруты, выхады з цяжкага становішча. Калі ёсць складанасці па дастаўцы лекаў камусьці, то нас аб гэтым інфармуе бальніца. Інакш кажучы, плячо ў плячо мы працуем з нашымі сацыяльнымі партнёрамі. Не пакідаюць нас без увагі грамадскія арганізацыі, такія як раённыя аб'яднанні Беларускага саюза жанчын, Беларускага Чырвонага Крыжа.

У цэнтры клапоцяцца не толькі аб старых. Ёсць занепакоенасць і аб сваіх работніках. «Мы, як ніхто іншы, павінны быць ў страі. Калі ўзнікнуць складаныя сітуацыі, мы мусім дапамагчы людзям. На сённяшні дзень у нашай установе разведзены патокі людзей, каб яны не перасякаліся паміж сабой. Для гэтага прызначаны розныя ўваходы і выхады. Акрамя таго, кожную раніцу праводзім тэрмаметрыю. Восенню нашы супрацоўнікі робяць прышчэпкі ад сезоннага грыпу. Цесна мы ўзаемадзейнічаем і з раённым аддзелам МНС, унутраных спраў, установамі аховы здароўя. Найлепшыя нашы сябры і сельскія Саветы», — падагульніла Святлана Маліноўская.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Інавацыі

Нейрасетка для выяўлення прыкмет COVID-19

У Беларусі выбралі найлепшыя інавацыйныя праекты

У Мінску ў навукова-тэхналагічным парку БНТУ «Палітэхнік» адбылося ўзнагароджанне пераможцаў, прызёраў і фіналістаў рэспубліканскага конкурсу інавацыйных праектаў 2020 года.

Найлепшымі распрацоўкамі сталі інавацыі ў галіне медыцыны і медыцынскіх тэхналогій. Пра гэта паведаміў на цырымоніі ўзнагароджання прызёраў і лаўрэатаў конкурсу **старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь Аляксандр ШУМІЛІН.** «У гэтым годзе як ніколі актуальныя распрацоўкі, скіраваныя на процідзеянне пандэміі і развіццё медыцынскіх тэхналогій», — падкрэсліў ён.

Так, у намінацыі «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект» перамагла распрацоўка студэнта педыятрычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Андрэя Капітонава — стварэнне нейрасеткі для аўтаматычнай класіфікацыі рэнтгенаграм органаў грудной клеткі. Гаворка ідзе пра магчымасць хуткага выяўлення прыкмет COVID-19 у асімптаматычных пацыентаў падчас правядзення рэнтгенаграфіі органаў грудной клеткі (R-ОГК). Асновай для стварэння нейрасеткі стануць звесткі як з адкрытых крыніц, так і з клінік Мінска, з якімі ўжо ўзгоднены доступ да даных інструментальных даследаванняў.

У намінацыі «Найлепшы інавацыйны праект» перамог Аляксандр Глуткін з Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Ён прадставіў касметычны комплекс GLUDERM, які складаецца з полікампанентнага крэму і гідрагелевай матрыцы для аднаўлення скуры пасля лячэння вострых і хранічных ран, а таксама для пацыентаў з атапічным дэрматытам і павышанай сухасцю скуры. У цяперашні час прэпарат рыхтуецца да вытворчасці ў Беларусі.

У 2020 годзе на рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў была пададзена 71 заяўка, з іх 24 — у намінацыі «Найлепшы інавацыйны праект» і 47 — у намінацыі «Найлепшы маладзёжны інавацыйны праект».

У адрозненне ад мінулага года найбольшая колькасць праектаў была прадстаўлена ў галіне сельскагаспадарчых навук і тэхналогій (21 працэнт) і медыцынскіх навук (19 працэнтаў). Дарэчы, у папярэднія гады найбольшая колькасць праектаў датычылася сферы IT-тэхналогій, электронікі і прыборабудавання.

У гэтым годзе разгляд і абарона праектаў праходзілі па-новаму: частка экспертаў удзельнічала ў анлайн-фармаце, а трохквілінныя пітч-прэзентацыі ўдзельнікаў паралельна транслявaліся па каналах сувязі. У фінале разбежка паміж прызёрамі склала дзясятыя долі бала.

Рашэннем савета конкурсу ў кожнай намінацыі быў абраны адзін пераможца і пяць прызёраў, па два праекты атрымалі другое месца, па тры — трэцяе. Іх аўтараў узнагародзяць каштоўнымі прызамі і грашовымі прэміямі ў памеры 2322 рублі, 1539 рублёў і 783 рублі за першае, другое і трэцяе месца адпаведна.

Як і летась, сярод пераможцаў і прызёраў конкурсу адабраны пяць праектаў для далейшай камерцыялізацыі. Кожны з іх атрымае сертыфікат на суму 15 417 рублёў. Акрамя таго, усім фіналістам конкурсу будуць уручаны спецыяльныя дыпломы ДКНТ і ўзнагароды ад міністэрстваў, тэхнапаркаў і прыватных кампаній.

Рэспубліканскі конкурс інавацыйных праектаў праводзіцца штогод Дзяржаўным камітэтам па навуцы і тэхналогіях і Беларускім інавацыйным фондам пры ўдзеле Міністэрства адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» і іншых арганізацый. Дадзены конкурс праводзіцца з 2010 года і з'яўляецца, па сутнасці, галоўным конкурсам краіны па выяўленні і прасоўванні маладых, таленавітых і перспектыўных спецыялістаў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«Январь на Драйве! Мастеркард»

1. Организатор Рекламной игры

Организатором Рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте», УНП 100422707 (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: 220030, Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334. Электронный адрес: post@forte.by.

2. Наименование и территория проведения Рекламной игры

Рекламная игра имеет наименование «Январь на Драйве! Мастеркард» (далее – Игра) и проводится на территории автозаправочных станций предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в Государственное производственное объединение «Белоруснефть» (далее – ПО «Белоруснефть»), находящихся в Республике Беларусь.

3. Срок начала и окончания Игры

Игра проводится с 01 января 2021 г. по 12 марта 2021 г. (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

4. Комиссия по проведению Игры

Для проведения Игры Организатор утверждает комиссию по проведению Игры (далее – Комиссия) в составе 5 человек, в том числе председателя Комиссии.

Состав Комиссии:

1. Даниленко Валерий Михайлович – Управляющий ООО «Рефорте», председатель комиссии;
2. Швед Екатерина Александровна – специалист по работе с клиентами ООО «Рефорте»;
3. Кричковская Светлана Владимировна – главный бухгалтер ООО «Рефорте»;
4. Даниленко Ольга Михайловна – специалист по рекламе ООО «Рефорте Групп»;
5. Чефанова Маргарита Игоревна – бухгалтер ООО «Рефорте».

5. Наименование товаров/услуг, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра

Игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard, эмитированных банками Республики Беларусь (далее Карта Mastercard), за исключением карт Maestro и Белкарт/ Maestro, для оплаты за покупку топлива на автозаправочных станциях предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в ПО «Белоруснефть».

6. Условия, при соблюдении которых физическое лицо становится Участником Игры

6.1. К участию в Игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет) граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства.

6.2. Участником Игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, члены Комиссии.

6.3. Для участия в Игре необходимо выполнить следующие условия:

- в период с 01 января 2021 г. по 31 января 2021 г. включительно совершить не менее трех покупок топлива отдельными чеками в различные даты по Карте Mastercard, эмитированной банками Республики Беларусь, за исключением карт Maestro и Белкарт/Maestro, на АЗС сети ПО «Белоруснефть» на сумму не менее 1 (одного) белорусского рубля в каждом чеке с использованием зарегистрированной накопительной информационно-учетной карты Участника Игры (в дальнейшем – Карта «Заправка»), которая определяет физическое лицо как участника программы поощрения клиентов (физических лиц) ПО «Белоруснефть» (далее – Программа «Заправка»), проводимой на АЗС сети «Белоруснефть».

Зарегистрированной считается Карта «Заправка» при указании ее владельцем в анкете регистрации следующих достоверных данных: фамилии, имени, отчества (при наличии), даты рождения, номера мобильного телефона операторов сотовой связи в международном формате, населенного пункта, а также адреса электронной почты.

6.4. Участник Игры может участвовать в Игре только один раз независимо от количества и сумм совершенных покупок.

7. Состав и размер призового фонда, источники его формирования

Размер призового фонда игры составляет **30 381, 38 (**тридцать тысяч триста восемьдесят один) белорусский рубль, 38 копеек. Состав призового фонда:

Наименование выигрыша (приза)	Количество, шт.	Общая стоимость призового фонда, бел. руб.
Автомобиль: «КИА RIO_FB» Год выпуска: 2020 Цвет кузова: черный стоимостью 26 450,00 белорусского рубля	1	**30 381,38**
и денежные средства в сумме 3 931,38 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза		

Источником формирования призового фонда Игры являются денежные средства и имущество Организатора.

8. Проведение розыгрыша призового фонда

8.1. Место, дата и время проведения розыгрыша

Розыгрыш призового фонда проводится открыто в присутствии Комиссии по адресу:

г. Минск, пр. Победителей, 143 (АЗС № 23 РУП «Белоруснефть-Минскавтозаправка»).

Дата и время проведения розыгрыша: 10 февраля 2021 г. в 18.30.

8.2. Порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей

8.2.1. До начала розыгрыша в установленном порядке Комиссией формируется список участников (далее – Список) с указанием данных, соответствующих условиям рекламной игры: присвоенного Участнику Игры порядкового номера Шанса, номера Карты «Заправка», фамилии, имени, отчества (при наличии) Участника Игры, даты рождения, электронного адреса, телефона и населенного пункта.

Каждому Участнику Игры, выполнившему условия, указанные в подпункте 6.3. правил Игры, присваивается порядковый номер Шанса по номеру Карты «Заправка» в порядке возрастания. Все номера Шансов имеют одинаковую разрядность.

8.2.2. Для проведения розыгрыша используется специальный вращающийся непрозрачный барабан и набор шаров в количестве 10 штук с номерами от 0 по 9.

Определение выигрышного номера Шанса происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из барабана.

Для определения цифры первого слева разряда выигрышного порядкового номера Шанса в барабан помещаются шары с номерами от «0» до цифры, соответствующей первой слева цифре последнего порядкового номера Шанса из Списка. Шары перемешиваются. Из барабана извлекается один шар. Номер извлеченного шара вносится в протокол и записывается в первый слева разряд формируемого выигрышного номера Шанса.

Далее аналогичным образом последовательно по одному определяются и фиксируются в протоколе второй и все последующие разряды выигрышного порядкового номера Шанса.

Определение 2 (двух) альтернативных выигрышных порядковых номеров Шансов (Альтернативного победителя № 1 и Альтернативного победителя № 2) происходит следующим образом: Альтернативным победителем № 1 признается Участник Игры с порядковым номером Шанса через 6000 номеров от победившего порядкового номера Шанса, Альтернативным победителем № 2 признается Участник Игры с порядковым номером Шанса через 12000 номеров от победившего порядкового номера Шанса.

В случае если выигрышный порядковый номер Шанса находится в конце Списка, то исчисление для определения Альтернативных победителей продолжается с начала Списка.

8.2.3. При проведении розыгрыша Комиссией оформляется протокол розыгрыша.

8.2.4. Участники Игры вправе присутствовать при проведении розыгрыша.

9. Срок и способ информирования победителя, место, порядок и срок выдачи выигрыша

9.1. После проведения розыгрыша Организатор уведомляет победителя о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 14 февраля 2021 г. включительно.

9.2. Для получения приза победителю необходимо в срок не позднее 17 февраля 2021 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: post@forte.by следующие данные:

9.2.1. Для граждан Республики Беларусь, а также иностранных граждан и лиц без гражданства, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь:

- копию страницы 25, страниц 31–33 паспорта – для граждан Республики Беларусь;
- копию страницы 3, страниц 15–17 вида на жительство – для лиц, имеющих вид на жительство на территории Республики Беларусь;

9.2.2. для иностранных граждан и лиц без гражданства, не имеющих вида на жительство:

- копию паспорта страны, гражданином которой он является (для лиц без гражданства – документ, подтверждающий их личность, выданный в порядке законодательства страны фактического проживания). В случае если данный документ выдан не на государственном языке Республики Беларусь, также заверенный нотариально перевод такого документа на государственный язык Республики Беларусь.

9.3. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 202/3 в срок не позднее 22 февраля 2021 г. включительно. Победитель предварительно согласовывает дату и время прибытия за получением приза с Организатором по телефону +375 29 678 94 39.

9.4. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с победителем любым из указанных выше способов, либо победитель не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо победитель отказывается от приза, либо победитель не явился за получением приза в установленный правилами Игры срок, либо принято решение об отказе в выдаче приза Победителю в связи с нарушением правил Игры, право на получение приза переходит к Альтернативному победителю № 1.

9.5. Альтернативный победитель № 1 при наличии оснований для выдачи ему приза уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 24 февраля 2021 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель № 1, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 26 февраля 2021 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: post@forte.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 202/3 в срок не позднее 04 марта 2021 г. включительно.

9.6. В случае если в установленные данными правилами сроки не удается связаться с Альтернативным победителем № 1 любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 1 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный победитель № 1 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 1 не явился за получением приза в установленный правилами Игры срок, либо принято решение об отказе в выдаче приза Альтернативному победителю № 1 в связи с нарушением правил Игры, право на получение приза переходит к Альтернативному победителю № 2.

9.7. Альтернативный победитель № 2 уведомляется о выигрыше по электронной почте, телефону и SMS не позднее 05 марта 2021 г. включительно. Для получения приза Альтернативный победитель № 2, которому перешло право на получение приза, должен не позднее 08 марта 2021 г. включительно предоставить Организатору по электронной почте: post@forte.by данные, указанные в п. 9.2. правил, а также согласовать дату и время получения приза. Вручение приза производится по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 202/3 в срок не позднее 10 марта 2021 г. включительно.

9.8. Альтернативный победитель № 2 утрачивает право на получение приза, если с ним не удается связаться любым из указанных выше способов, либо Альтернативный победитель № 2 не предоставит данные, необходимые для получения приза, либо предоставленные данные не соответствуют данным, указанным в анкете участника программы лояльности клиентов – физических лиц ПО «Белоруснефть», заполняемой при регистрации Карты «Заправка», либо Альтернативный победитель № 2 отказывается от приза, либо Альтернативный победитель № 2 не явился за получением приза в установленный правилами Игры срок, либо принято решение об отказе в выдаче ему приза в связи с нарушением правил Игры.

9.9. В случае если победитель (соответственно Альтернативный победитель № 1 или Альтернативный победитель № 2) не может приехать за получением приза лично, приз может получить его доверенное лицо по предъявлении копии паспорта либо вида на жительство победителя (соответственно Альтернативного победителя № 1 или Альтернативного победителя № 2), своего паспорта либо вида на жительство и надлежащим образом заверенной доверенности от победителя (соответственно Альтернативного победителя № 1 или Альтернативного победителя № 2).

9.10. С момента передачи приза к победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или Альтернативному победителю № 2) переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом. Денежная компенсация стоимости призов не производится. Победитель (соответственно, Альтернативный победитель № 1 или Альтернативный победитель № 2) в случае его нежелания получить приз не вправе передать право на получение приза другому лицу. Приз не подлежит замене.

9.11. В соответствии с законодательством Республики Беларусь при выдаче приза Организатор удерживает и перечисляет в бюджет подоходный налог в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь, из суммы денежных средств приза. Вручение приза осуществляется за минусом удержанной суммы подоходного налога из денежной части приза.

9.12. Организатор не оплачивает победителю (соответственно Альтернативному победителю № 1 или Альтернативному победителю № 2) расходы, связанные с проездом к месту получения приза.

9.13. Участник Игры, претендующий на получение приза, должен заполнить и подписать все необходимые документы, предоставляемые Организатором Игры для получения приза.

10. Иные условия

10.1. Участие в Игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников Игры с настоящими Правилами.

10.2. Факт участия в Игре означает, что Участники Игры соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фото-, аудио-, видео- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победитель Игры дает свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Игры, без выплаты ему какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

10.3. Правила проведения Игры вместе с реквизитами государственной регистрации публикуются до начала Игры в газете «Звязда».

10.4. Сведения о результатах проведения Игры публикуются не позднее 12 марта 2021 г. в газете «Звязда».

10.5. Телефон для справок по вопросам проведения Игры: + 375 29 678 94 39 работает в период проведения Игры круглосуточно без выходных.

Свидетельство № 3919 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 28.12.2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703**
Продавец	**ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38**

Предмет аукциона

Лот № 1
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, 33**

Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц: ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**)

Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 186 626,88 бел. руб.
Шаг аукциона – 9 331,34 бел. руб.

Лот № 2 (одним лотом)
Местоположение – **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер	Адрес (номер дома)
Изолированное помещение № 1 (производственное помещение)	206,3 кв. м	600/D-91728	3А-4
Изолированное помещение № 2 (административное помещение)	221,7 кв. м	600/D-91729	3А-4а
Изолированное помещение № 3 (производственное помещение)	288,4 кв. м	600/D-91730	3А-4б
Административное помещение	233,6 кв. м	600/D-40239	3-5
Административное помещение	83,9 кв. м	600/D-40241	3-6
Складское помещение	205,2 кв. м	600/D-40243	3-7

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 1 574 400,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 78 720,00 бел. руб.

Лот № 3
Местоположение **– г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Помещение санитарно-бытового назначения	1,7 кв. м	500/D-7028275

Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 3 552,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 177,60 бел.руб.

Лот № 4
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, д. 33-6**

Наименование (назначение)	Общая площадь	Инвентарный номер
Административно-торговое помещение	733,5 кв. м	500/D-7023833

Начальная цена лота № 4 (с НДС 20 %) – 2 605 200,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 130 260,00 бел. руб.

Лот № 5
Местоположение **– г. Минск, ул. Замковая, д. 33-1а**

Кабинеты (административное помещение)	87,9 кв. м	500/D-708041778

Составные части и принадлежности: открытая автостоянка пл. 523 кв. м

Начальная цена лота № 5 (с НДС 20 %) – 476 400,00 бел. руб.
Шаг аукциона – 23 820,00 бел. руб.

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **ipmtorgi.by**

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **20 (двадцати) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона, либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона, исчисляемое в процентном соотношении от цены продажи (4 % – по лотам № 1, 3; 3 % – по лотам № 2, 5; 2 % – по лоту № 4) в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.11.2020

Дата и время проведения аукциона	**11.01.2021 в 14.00, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**
Дата и время начала и окончания приема заявлений	**С 09.00 29.12.2020 до 17.00 06.01.2021, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»**

Контактные телефоны:
+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06.
E-mail: auction@ipmconsult.by

Ігар БУЗОЎСКІ:

«Кніга — гэта ўнікальны аб'ект, здабытак чалавецтва»

Кнігавыданне, вядома ж, нельга лічыць чыста вытворчай сферай. У гэтым працэсе закладзены і прысутнічае важкі гуманітарны складнік. У Беларусі кнігавыдавецкай справе заўсёды аддавалася асаблівая ўвага. Нядзіўна, калі ўлічваць, што менавіта выхадзец з тутэйшых мясцін, знакаміты Францыск Скарына, некалі праславіўся на ўсю Еўропу як першадрукар. Хіба можна абрываць такую ўражальную сувязь часоў?! Але адна справа — ганарыцца няхай і слаўным, але мінулым, і зусім іншая — падтрымліваць традыцыю высокай планкай сучасных дасягненняў.
Пра сённяшнія рэаліі беларускага кнігавыдання — у размове з намеснікам міністра інфармацыі Ігарам Бузоўскім, які непасрэдна курыруе гэтую галіну.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

— Перш за ўсё, давайце з вашай дапамогай удакладнім: што ўяўляе сабой у сучаснай Беларусі такая галіна, як кнігавыданне? Наколькі яна значная для грамадства, для краіны?

— Мяркую, што пераацаніць сёння сэнс такіх паняццяў, як кнігавыданне і кнігараспаўсюджванне, немагчыма, гэта два неаддзельныя складнікі, праз якія даводзіцца да спажыўца сацыяльна значны прадукт — кніга, без чаго, вобразна кажучы, як без хлеба, без вады, сучаснае грамадства існаваць не можа. Нягледзячы на ўдасканальванне тэхналогій, на імклівае развіццё камп'ютарызацыі, інфармацыйных сетак, кніга застаецца вельмі сур'ёзным захавальнікам гістарычнай спадчыны і традыцый народа, важкім інструментам уплыву на фарміраванне такіх паняццяў, як дзяржаўнасць, культура, менталітэт. Яна па-ранейшаму адыгрывае значную ролю ў многіх сферах жыццядзейнасці чалавека. Але я хацеў бы асабліва падкрэсліць, што нельга пераацаніць значэнне тых умоў, якія створаны і ствараюцца нашай дзяржавай для кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання. Калі аналізаваць тое, што робіцца ў гэтым рэчышчы, то варта адзначыць стварэнне і развіццё гандлёвай сеткі «Белкніга», дзе заўсёды разам з камерцыйнай кнігай прысутнічае сацыяльна значная літаратура. Менавіта сацыяльна значная літаратура з'яўляецца неад'емнай часткай кнігавыдання, якое каардынуецца, у тым ліку, Міністэрствам інфармацыі. Гэта датычыцца ў першую чаргу нашых дзяржаўных выдавецтваў, якія забяспечваюць не толькі так званай камерцыйнай кнігай, але і той, якая выхоўвае, спрыяе стварэнню ментальнасці, дазваляе фарміравацца грамадству як адзінаму арганізму.

— Якая ўвогуле структура галіны? Хто ў большай ступені выступае ў якасці выдаўцоў і друкароў кніжнай прадукцыі: дзяржаўныя ўстановы ці, магчыма, прадстаўнікі бізнесу?

— Сёння ў Беларусі зарэгістравана 185 паліграфічных прадпрыемстваў, з якіх 53 друкарні — дзяржаўныя: 12 рэспубліканскіх і 27 камунальных унітарных прадпрыемстваў, 14 дзяржаўных устаноў, у тым ліку 11 ВНУ. Гэта калі казаць пра дзяржаўную паліграфічную структуру.

Бізнес прадстаўлены ў асноўным рознымі акцыянернымі таварыствамі — 99 арганізацый, і прыватнымі ўнітарнымі прадпрыемствамі — 31 арганізацыя. Працуюць на рынку таксама індывідуальныя прадпрымальнікі і грамадскія арганізацыі.

Як бачна, бізнес на беларускім рынку паліграфічных паслуг прысутнічае досыць шырока. Інакш кажучы, работа тут вядзецца сумесная, і мы зацікаўлены ў тым, каб у ёй і надалей бралі ўдзел суб'екты гаспадарання розных форм уласнасці.

Дарэчы, на пачатак снежня ў Дзяржаўным рэестры выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў друкаванай прадукцыі ў якасці выдаўцоў было зарэгістравана 522 суб'екты гаспадарання, у якасці распаўсюджвальнікаў — 1940. Гэта досыць вялікая сетка, унушальны механізм, што, у сваю чаргу, стварае добрыя магчымасці на гэтай ніве ў маштабах краіны.

Між іншым, тут нельга не сказаць аб дзяржаўных выдавецтвах, якія працуюць у непасрэднай сувязі з Міністэрствам інфармацыі. Гэта выдавецтвы «Беларусь» і «Мастацкая літаратура», дзе сёння ёсць нямала спецыялістаў з багатым вопытам работы ў сваёй сферы. Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выпускае эксклюзіўныя, сапраўды ўнікальныя кнігі. Варта казаць і аб значнай ролі выдавецтваў «Народная асвета», «Вышэйшая школа», супрацоўнікі якіх заклапочаны падрыхтоўкай і выданнем літаратуры для ўстаноў адукацыі. Нельга не згадаць рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову «Выдавецкі дом «Звязда», дзе паспяхова рэалізуюцца адметныя сацыяльныя кніжныя праекты. Усё гэта — адзіны арганізм, які дазваляе нам працаваць над выкананнем тых задач, што стаяць перад дзяржавай па кнігавыданні.

— Цікава, якога кшталту літаратура — вучэбная, мастацкая, метадычная, краязнаўчая — сёння найбольш запатрабаваная?

— Найбольшым попытам карыстаецца, зразумела, вучэбна-метадычная літаратура. У яе самая вялікая ўдзельная вага продажу: 46 працэнтаў. Гэтая лічба, магчыма, нават заніжаная, калі разважаць пра тое, што падпадае пад такі крытэрый. Ёсць дзелавая літаратура, якую ў пэўнай ступені таксама можна аднесці да вучэбна-метадычнай, бо яна нярэдка выкарыстоўваецца ў адукацыйных мэтах. А дзелавая літаратура, між іншым, у тэматычнай структуры продажу кніжнай прадукцыі складае 17 працэнтаў. Далей ідзе мастацкая літаратура — 15 працэнтаў, дзіцячая — 12, літаратура прыкладнога характару — 6 працэнтаў, іншая — 4. Па водгуках прадаўцоў кніжнай прадукцыі, тых, хто непасрэдна ўдзельнічае ў камунікацыі з пакупнікамі, вялікая цікавасць па-ранейшаму захоўваецца да літаратуры па самаразвіцці. Такі інтарэс чытачоў выкліканы рознымі прычынамі, тым не менш, — гэта факт.

— Няцяжка прадбачыць, што лідарам у краіне па канцэнтрацыі выдавецкай дзейнасці з'яўляецца Мінск. А якія рэгіёны, акрамя сталіцы, вы маглі б яшчэ вылучыць па гэтым паказчыку?

— Як я ўжо казаў, на сённяшні дзень у Міністэрстве інфармацыі зарэгістравана 185 паліграфічных прадпрыемстваў. Гэта не значыць, што ўсе яны працуюць у выдавецкай сферы ў нейкім вялікім фармаце. Але яны зарэгістраваныя, а значыць, маюць права на такога роду дзейнасць. Натуральна, асноўная колькасць паліграфічных прадпрыемстваў размешчана ў цэнтральным рэгіёне краіны: 117 — у горадзе Мінску і 19 — у Мінскай вобласці. У Гомельскай вобласці працуе 13 друкарняў — гэта другі паказчык па маштабе паліграфічнай дзейнасці. У Гродзенскай і Брэсцкай абласцях — па 12 прадпрыемстваў. Менш развітая паліграфічная галіна ў Віцебскай вобласці (7 друкарняў) і Магілёўскай вобласці (5 друкарняў).

Хацелася б адзначыць, што дзяржаўная паліграфія прадстаўлена ў рэгіёнах на добрым узроўні. Разам з абласнымі друкарнямі ў Брэсце, Віцебску, Гродне, Магілёве, камунальным прадпрыемствам «Палесдрук» у Гомелі параўнальна буйныя дзяржаўныя друкарні працуюць у Пінску, Лідзе, Полацку, Наваполацку, Мазыры, Бабруйску, Жлобіне. Што характэрна, сёння ўсе гэтыя прадпрыемствы ў стане забяспечыць ва ўмовах адчувальнай канкурэнцыі на рынку паліграфічных паслуг выпуск якаснай прадукцыі. Нягледзячы на, магчыма, невялікія інвестыцыйныя ўкладанні, тут па традыцыі працуюць высакакласныя спецыялісты. Менавіта прафесіяналы дазваляюць даваць фору новым прадпрыемствам, якія спрабуюць набываць сучаснае паліграфічнае абсталяванне. Зрэшты, яно даволі дарагое. З гэтай прычыны сур'ёзныя рыўкі тут — вельмі складаная справа. Сапраўды, стаўка робіцца на мадэрнізацыю, але ў першую чаргу — на прафесіяналаў.

— А як дзяржава рэгулюе такую сферу, як кнігавыданне? Ці існуюць абмежаванні на заняткі падобнага роду дзейнасцю?

— Улічваючы высокую сацыяльную значнасць друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, кніжнай прадукцыі для фарміравання культурных каштоўнасцяў, менталітэту і нават стратэгіі развіцця грамадства — гэта даволі сур'ёзны інструментарый. Таму на дзяржаўным узроўні аддаецца значная ўвага рэгуляванню выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці. У прыватнасці, Указам Прэзідэнта ад 1 верасня 2010 года ліцэнзуецца выраб друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, газет і часопісаў. У адпаведнасці з нормамі Закона «Аб выдавецкай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь» таксама ажыццяўляецца рэгістрацыя выдаўцоў, вытворцаў і распаўсюджвальнікаў кніг, брашур, паштовак, плакатаў.

— Якія асноўныя тэндэнцыі апошняга часу ў сферы выдавецкай творчасці кніг і іншых друкаваных выданняў вы адзначылі б? У якой меры лічбавыя тэхналогіі ўплываюць на гэты працэс?

— Час не стаіць на месцы. Мы таксама адзначаем цікавасць, якая ёсць да электронных сродкаў масавай інфармацыі, да таго ж друкаванага слова, але ўжо ў электронным фармаце. Гэта і электронная кніга, і інтэрнэт, і аўдыё. Але калі гаворым пра падобнага роду тэндэнцыі, заўсёды неабходна адзначаць тое, у якіх памерах адбываюцца такія змены: палова чытачоў сышла ў інтэрнэт, перайшла на электронную кнігу ці ўсе 90 працэнтаў? Не, як правіла гэта нязначныя працэнты, але яны падвоіліся. Было 4, стала 8. Так, мы адзначаем, што цікавасць узрастае, цікавасць ёсць, але па-ранейшаму да кнігі друкаванай, да папяровай кнігі таксама захоўваецца інтарэс. Людзі хочуць бачыць, трымаць у руках кнігу. Тактыльнае адчуванне, зручнасць — яны выпрацаваны стагоддзямі. Я ўпэўнены, дадзеная тэндэнцыя будзе захоўвацца. І не з нагоды нашых жаданняў альбо камерцыйных інтарэсаў прадпрыемстваў, а з прычыны таго, што на самай справе гэта ўнікальная з'ява, унікальны аб'ект. Кніга — здабытак чалавецтва. І дынаміка, я ўпэўнены, неўзабаве, у тым ліку і ў нас, пачне мяняцца. Сусветная тэндэнцыя ўжо сведчыць: падзенне попыту на папяровую кнігу, якое назіралася ў многіх краінах свету, пачынае выраўноўвацца. Так, тэндэнцыя кнігавыдання, з аднаго боку, перажывае і ў нас, у Беларусі, пэўныя выпрабаванні новымі тэхналогіямі: зручнасцю паслухаць і пачытаць у інтэрнэце, магчымасцю на планшэце ўбачыць электронную кнігу, спампаваць яе. Тым не менш, паўтаруся: цікавасць да традыцыйнай, друкаванай кнігі застаецца.

Што датычыцца кнігавыдання, безумоўна, мы сёння адчуваем сур'ёзную канкурэнцыю ў сувязі з глабалізацыяй эканомікі, сутыкаемся з вялізнай перавагай, якая ёсць у буйных карпарацый для распаўсюджвання рэкламы нейкага аднаго аўтара. Хочам мы ці не, але з гэтым трэба лічыцца.

Ёсць пытанні, якія звязаны з паліграфічнымі магчымасцямі. Калі не мадэрнізаваць, не праводзіць абнаўленне тэхнікі, якая друкуе якасную кнігу, калі не берагчы друкароў-прафесіяналаў, якія ўмеюць друкаваць такую кнігу, мы адстанем. Як вынік такой сумнай перспектывы — будзем вымушаныя проста купляць чужую кнігу. Таму важна не спыняць працэс кнігавыдання ў краіне пры любых умовах. Вось чаму сёння ў Беларусі аддаецца вялікая ўвага абнаўленню паліграфічнай галіны, дзе флагманам справядліва лічыцца ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».

Несумненна, кніга па-ранейшаму застаецца таварам, запатрабаваным на рынку. У кожнай рынкавай сістэме з цягам часу адбываюцца пэўныя змены, не стаў выключэннем і рынак кніжнай прадукцыі. Развіццё тэхнікі ў спалучэнні з працэсамі, што маюць месца ў самім кнігавыданні, — скарачэнне тыражоў, паляпшэнне якасці і павышэнне мастацкага аздаблення друкаванай прадукцыі — спрыялі актыўнаму ўкараненню лічбавых тэхналогій у выдавецкай справе. Прынамсі ўжо некалькі апошніх дзесяцігоддзяў працэс выдавецка-рэдакцыйнай падрыхтоўкі выданняў немагчыма ўявіць без выкарыстання камп'ютарных тэхналогій, а лічбавае абсталяванне дазваляе выпускаць ілюстраваныя выданні невялікімі накладамі.

— Як выглядаюць беларускія кнігавыдаўцы на фоне суседзяў? Наколькі ў цэлым высокі іх міжнародны статус?

— Штогод беларускія кнігавыдаўцы бяруць удзел у Міжнародным конкурсе дзяржаў — удзельніц СНД «Мастацтва кнігі», які арганізуе Міждзяржаўны савет па супрацоўніцтве ў галіне перыядычнага друку, кнігавыдання, кнігараспаўсюджвання і паліграфіі пры падтрымцы Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц СНД.

У 2020 годзе на XVII міжнародны конкурс «Мастацтва кнігі» было прадстаўлена 75 выданняў з шасці краін. У жніўні ў Выканаўчым камітэце СНД у Мінску ў рэжыме відэаканферэнцыі адбылося пасяджэнне журы, у склад якога ўвайшлі прадстаўнікі Арменіі, Беларусі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі і Таджыкістана. Па выніках конкурсу кнігі беларускіх выдавецтваў атрымалі першыя месцы ў намінацыях «Садружнасць», «Дыялог культур», «Кніга для дзяцей і юнацтва», «Навука і адукацыя», «АРТ-кніга», «Надрукавана ў Садружнасці», «Перамога», «Гран-пры», другія месцы — у намінацыях «Мая краіна» і «Мастацтва ілюстрацыі». Шэраг беларускіх кніг былі ўдастоены спецыяльных дыпломаў.

Трэба сказаць, што за 17 гадоў існавання конкурсу СНД «Мастацтва кнігі» Беларусь па колькасці ўзнагарод займае першае месца (163 дыпломы, у тым ліку дзесяць найвышэйшых узнагарод конкурсу — Гран-пры). Беларускія кнігі вылучаюцца сярод выдавецтваў іншых краін не толькі мастацкім і дызайнерскім афармленнем, але і сацыяльнай тэматыкай, навуковымі даследаваннямі. Прычым у некаторых намінацыях нам няма роўных, і гэтым нам варта ганарыцца як прадаўжальнікам традыцый Францыска Скарыны. Мяркую, мы яшчэ шмат выйграем прызоў, таму што ў нас захавалася школа прафесійнага афармлення, прафесійнага дызайну і мастацтва кнігавыдання.

— Традыцыйна ў Мінску штогод у першыя дні лютага праводзіцца міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Не будзе перабольшаннем сказаць, што яна з'яўляецца аўтарытэтнай пляцоўкай, на якой адбываецца ў тым ліку і абмен думкамі па пытаннях кнігавыдання. Нездарма колькасць удзельнікаў гэтага мерапрыемства заўсёды ўражвае. Якім вам бачыцца чарговае правядзенне выстаўкі?

— Міжнародная мінская кніжная выстаўка-кірмаш — візітная картка і сталіцы, і краіны ў цэлым. Гэта месца, дзе можна ўбачыць і набыць кнігі розных дзяржаў. У першую чаргу, гэта перагаворная пляцоўка і магчымасць планавання сумесных доўгатэрміновых праектаў, у тым ліку ў сферы кнігавыдання і кнігараспаўсюджвання. Гэта сустрэчы з аўтарамі, дыскусіі. Мы ўжо прыступілі да працы па падрыхтоўцы чарговай мінскай кніжнай выстаўкі-кірмашу, неад'емнай часткай якой традыцыйна будзе і міжнародны сімпозіум «Пісьменнік і час». Мы заўсёды падкрэсліваем, што кніжная выстаўка-кірмаш у Мінску — гэта інтэлектуальная пляцоўка, дзе ёсць магчымасць гаварыць не толькі на прафесійныя тэмы, але і пра тое, што сёння хвалюе грамадства, чалавечую супольнасць у цэлым.

Размову вёў Віктар ХАРКОЎ.

МУЗЕЙ І МЕДЫЯ: НОВЫ ПОГЛЯД

Як прайшоў першы год новага спецыялізаванага часопіса

Калі азірнуцца навокал, то і пры выразным развіцці краязнаўчай справы на ўсёй постсавецкай прасторы сістэмнай перыёдыкі па гэтай тэме не так ужо і шмат. Прычын тут можа быць некалькі. Па-першае, краязнаўства ва ўсе часы носіць у значнай ступені грамадскі характар. Па-другое, тэма рэгіёназнаўства, радзімазнаўства знаходзіць сваё месца ў самых розных масмедыя — ад мясцовых да рэспубліканскіх грамадска-палітычных газет.

І ўсё ж выдання кшталту часопіса дваццатых гадоў мінулага стагоддзя — «Наш край», дзе супольна разглядаліся б і практыка, і методыка краязнаўчай работы, дзе знаходзілася месца агляду памкненняў іншых краін і народаў да арганізацыі вывучэння гісторыі, да гістарычнага выхавання грамадства, заўсёды не хапае. І ў мінулыя дзесяцігоддзі, і сёння.

Так, цяпер у выдавецтве «Адукацыя і выхаванне» выходзіць «Беларускі гістарычны часопіс», які аб'ядноўвае навукоўцаў. Былі да нядаўняга часу часопісы «Спадчына», «Беларуская мінуўшчына» (у ім, між іншым, праяўлялася найбольшая тэматычная акрэсленасць у дачыненні да краязнаўства). Намаганнямі Беларускага фонду культуры выходзіць сёння «Краязнаўчая газета». Ёсць у Нацыянальным гістарычным музеі неперыядычнае выданне «Музейны веснік». І на фоне ўсіх гэтых масмедыя, як і на фоне недахопу гісторыка-краязнаўчага выдання, здольнага кансалідаваць грамадства ў вывучэнні гісторыі Айчыны ўсімі сіламі — і навукоўцаў, і культурна-асветніцкіх работнікаў, і настаўніцтва, і проста грамадскасць, рашэнне ўрада і Міністэрства культуры, у прыватнасці, аб выданні штоквартальнага часопіса «Беларускі музей», стала сапраўднай падзеяй.

Заснавальнікам новага штоквартальнага выдання, абазначанага як навукова-папулярны часопіс, выступіў Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь. Галоўны рэдактар першага нумара — Кастусь Сталярчук (з другога нумара абавязкі рэдактара выконвае дырэктар музея Павел Сапоцька) ва ўступным слове да сакавіцкага выпуску выказаў наступнае: «Беларускі музей» — выданне навукова-папулярнае, закліканае адлюстроўваць тое галоўнае, што адбываецца ў музейнай навуцы і ў саміх

музеях, перш за ўсё беларускіх. Ад аўтараў гэта патрабуе празрыстасці сэнсу, вобразнасці пераказу, уменння не зніжаць планку чытацкай цікавасці. З улікам «законаў жанру» рэдакцыйная калегія вырашыла ахвяраваць падрадковымі зноскамі (адно з патрабаванняў да сур'ёзных навуковых артыкулаў). Выключэнні даюцца толькі ў асобных выпадках, якія прадыктаваны ў першую чаргу тэмай. Мяркуецца, што ва ўсіх нумарах тэксты будуць суправаджацца багаццем ілюстрацый» . І далей: «БМ» — інтэлектуальны прадукт, які праходзіць праз прызму журналісцкіх клопатаў аб папулярызацыі музейнай навукі»...

Стваральнікі новага часопіса заклікалі прапаноўваць свае матэрыялы музейных супрацоўнікаў, краязнаўцаў, гісторыкаў, этнолагаў, мастацтвазнаўцаў, культуролагаў, выкладчыкаў ВНУ, іншых спецыялістаў і ўсіх чытачоў, неабыякавых да лёсу музеяў.

2020 год падышоў да свайго завяршэння. Перад намі — чатыры нумары часопіса «Беларускі музей». Яны даюць усе падставы паразважаць, якая ўсё ж задача выканана, як яна выканана, якія вымалёўваюцца перспектывы. У чатырох нумарах — больш за паўсотню публікацый. Сапраўды, яны выкананы ў розных жанрах: ёсць і карэспандэнцыя, і грунтоўны навуковы артыкул, і публіцыстычны нарыс, і рэпартаж, і паведамленне... Дзякуючы шырокай палітры публікацый чытач можа ажыццявіць віртуальнае падарожжа ў розныя музейныя, гістарычныя адрасы нашай краіны — Оршу, Добруш, Ветку, Мір, Віцебск, Залессе, Кушляны, Нясвіж, Ружаны, Дымава (гэта — Шклоўскі раён), Стоўбцы, Гомель, Брэст, Асіповічы, Акопы, Магілёў... Багата ілюстраваныя артыкулы, рэпартажы прысвечаны тэмам асобных калекцый, асобным персанажам айчыннай гісторыі. Літаральна кожная з публікацый настолькі захапляльная, што складваецца ўражанне прысутнасці ў той ці іншай мясціне, добрага знаёмства з персанажамі айчыннай гісторыі, якія сваімі справамі ўслаўлялі Беларусь, пра якіх невыпадкова расказваюць музейныя экспазіцыі ці нават асобныя музеі ў той ці іншай старонцы.

Згадаем хоць бы некаторых аўтараў «Беларускага музея»: намеснік дырэктара па навуковай рабоце Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Надзея Стрыбульская, намеснік дырэктара па навуковай рабоце Віцебскага абласнога краязнаўчага музея Валерый Шышанаў, генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Уладзімір Пракапцоў, дырэктар музея Марка Шагала ў Віцебску Ірына Воранава, старшы навуковы супрацоўнік Музея Марка Шагала ў Віцебску Алена Ге, загадчык аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Нацыянальнага гістарычнага музея Надзея Саўчанка... Кожны з аўтараў — літаральна Асоба ў музейнай справе! І кожны з аўтараў здолеў расказаць пра тое, з чым звязаны гадамі пошуку, настойлівай работы па тым ці іншым тэматычным кірунку. І калі часам некаторыя публікацыі носяць аглядны характар, з'яўляюцца своеасаблівымі «ўводзінамі» ў музей ці экспазіцыю, іншыя з іх адкрываюць зусім невядомыя дагэтуль факты, з'явы, падзеі. Вось, напрыклад, артыкул маскоўскага калекцыянера Андрэя Кусакіна і вядучага навуковага супрацоўніка Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь Юрыя Піскуна «Расказала акварэль...» Размова — пра акварэльны малюнак з выявай горада Магілёва. Акварэль устаўлена ў аўтэнтычную раму, тыповую для другой чвэрці XIX стагоддзя: з пазалотай, рэльефнымі арнаментальнымі накладкамі па вуглах, рэльефнай накладкай у сярэдзіне ніжняга поля з гербам Магілёва. «Літоўская пагоня на чырвоным полі. У верхняй частцы герба — палова расійскага двухгаловага арла», зацверджанага пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай і ўключэння Магілёва ў склад Расійскай імперыі. Рама каштоўная знакавай прысутнасцю на ёй магілёўскага герба і добрай захаванасцю — ёсць нават арыгінальнае шкло XIX стагоддзя з няроўнай таўшчынёю... Назва акварэлі — «Від горада Магілёва на Дняпры з Чарнігаўскай дарогі». Аўтар — магілёўскі губернскі архітэктар Аляксандр Бусырскі. У артыкуле — падрабязны разгляд унікальнага мастацка-дакументальнага сведчання па гісторыі горада 1840-х гадоў. Альбо яшчэ адна публікацыя — «Загадкі Дымаўскай сядзібы» навуковага супрацоўніка Шклоўскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея Ірыны Гапеевай. Аўтар запрашае чытача пазнаёміцца з лёсам рускага ваеначальніка, палявога археолага і нумізмата Мікалая Турбіна на фоне аповеду пра сядзібу ў Дымаве. Дарэчы, многія старонкі часопіса — добрая падказка для журналістаў розных выданняў: куды з'ездзіць, што расказаць чытачу.

Чатыры нумары «Беларускага музея» высвятляюць яшчэ і характар актыўнасці аўтараў з таго ці іншага рэгіёна. Канешне ж, часопіс стаў добрай пляцоўкай для гісторыка-публіцыстычнай работы супрацоўнікаў Нацыянальнага гістарычнага музея. Прыкметны на старонках выдання і Нацыянальны мастацкі музей. Грунтоўным, манаграфічнага характару падаецца і артыкул пра яго кіраўніка — «Адчуць мастацкую аўру майстра: Асоба Вітольда Бялыніцкага-Бірулі ў мастацтвазнаўстве і творчасці Уладзіміра Пракапцова», аўтарам якога з'яўляецца дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Валерый Жук. Вылучаецца сярод іншага і замкавы комплекс «Мір». Відавочна, музейныя супрацоўнікі зацікаўлены выкарыстоўваць такую аўтарытэтную медыйную пляцоўку для апавядання пра свае зборы, пра свае праекты, за кожным з якіх — грунтоўная праца, уважлівы пошук.



Вось як падсумоўвае першы год выдання «Беларускі музей» яго **галоўны рэдактар і дырэктар Нацыянальнага гістарычнага музея Павел САПОЦЬКА:**

— У першы год свайго існавання часопіс знаходзіўся ў працэсе пошуку, разам з тым ужо сёння можна казаць пра рубрыкі, якія нам падаюцца найбольш актуальнымі: «Вытокі» (з гісторыі музейнай справы ў Беларусі), «Збор» (музейныя калекцыі), «Экспазіцыйныя праекты» (стацыянарныя экспазіцыі і часовыя выстаўкі), «Замежжа» (замежны вопыт, музейныя навіны), «Выданні» (каталогі, альбомы і іншае), «Музейная аўдыторыя» (культурна-адукацыйныя і культурна-асветніцкія праграмы), «Асоба» (энтузіясты музейнай справы), «Музей XXI стагоддзя» (новыя тэхналогіі ў музейнай практыцы). Гэта не поўны пералік рубрык, іх колькасць і наяўнасць будуць залежаць ад надзённых праблем музея. Заўважу, што часопіс «Беларускі музей» — сумесны і, дарэчы, не адзіны зладжаны ў 2020 годзе праект Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь і яго генеральнага партнёра кампаніі «Джапан Табака Інтэрнэшнл ЭсЭндДзі». Выдавецкія праекты — альбом і каталог «І рай і боль на Песеннай Зямлі... Беларусь вачыма мастакоў 1920— 1930-х гадоў» (на падставе музейнай калекцыі графікі) і альбом «Адраджэнне і вяртанне» (да 25-годдзя нараджэння М. К. Агінскага), віртуальны праект «Музыка герояў. Мелодыі Перамогі» (да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне), а яшчэ маштабны І Рэспубліканскі краязнаўчы форум, у якім узяло ўдзел больш за 250 чалавек — вынікі супольнай працы кампаніі і музея ў рамках дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Таксама музей і кампанія JTI заснавалі шматгадовую сацыяльную праграму «Інклюзіўная Беларусь. Уключыся ў музей!», накіраваную на стварэнне безбар'ернага асяроддзя для людзей са слабым зрокам і сляпых наведвальнікаў, а таксама наведвальнікаў з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. Што датычыцца часопіса «Беларускі музей», дзякуючы фінансавай падтрымцы нашага генеральнага партнёра кожны музей сістэмы Міністэрства культуры, а таксама нашы замежныя калегі змаглі атрымаць у якасці падарунка ўсе яго чатыры выпускі.

Цяпер «Беларускаму музею» засталося стаць яшчэ і ў некаторай ступені і масавым, запатрабаваным грамадскасцю выданнем. Нацыянальны гістарычны музей зрабіў дзеля гэтага ўсё магчымае. Слова — за музеямі краіны. І дзяржаўнымі, і грамадскімі. І прыватнымі.

СУЧАСНЫ СТАН БЕЛАРУСКАГА КРАЯЗНАЎСТВА

Даследчыкі з усіх куткоў краіны аб'ядналіся ў жаданні адлюстраваць агульны гістарычны партрэт нашай Бацькаўшчыны

Вынікі не толькі 2020 года, але як мінімум усяго трохгоддзя Года малой Радзімы ў галіне беларускага краязнаўства падсумоўвае выданне «Першы Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі ў рамках Года малой радзімы: зборнік матэрыялаў», якое толькі што пабачыла свет у межах супрацоўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея і Беларускага фонду культуры.

На старонках двухтомнага выдання выступілі 252 аўтары: гісторыкі, літаратуразнаўцы, мастацтвазнаўцы, музейныя работнікі, бібліятэкары, журналісты, школьныя настаўнікі, экскурсаводы... Дарэчы, варта было б разгледзець нават з сацыялагічнага пункту гледжання, як даследчыкаў цікавіць краязнаўства. Пра што матэрыялы, сабраныя пад адной вокладкай? Тэматычна яны падзелены па секцыях згодна з праграмай форуму: «Краязнаўства ў сістэме навукова-даследчай работы»; «Краязнаўства ў вучэбна-выхаваўчым працэсе ўстаноў адукацыі»; «Асоба

ў краязнаўстве: з гісторыі біяграфій беларускіх краязнаўцаў»; «Экалагічнае краязнаўства і турыстычная дзейнасць». Асобна вылучаны секцыя «Студэнцкая канферэнцыя «Моладзь і краязнаўства» і канферэнцыя школьнікаў «Пазашкольнае краязнаўства: вопыт рэгіёнаў». На пленарным пасяджэнні выступілі з дакладамі: старшыня Беларускага фонду культуры Т. Стружэцкі («Краязнаўства ў Беларусі: здабыткі, праблемы і перспектывы развіцця»), кандыдат гістарычных навук В. В. Даніловіч («Дзейнасць Інстытута гісторыі НАН Беларусі па даследванні і папулярызацыі рэгіянальнай гісторыка-культурнай спадчыны»), А. Я. Кравец («Арганізацыя краязнаўчай работы ва ўстановах адукацыі Рэспублікі Беларусь»).

Неабходна нагадаць, што да арганізацыі краязнаўчага форуму спрычыніліся органы дзяржаўнага кіравання краіны — міністэрствы інфармацыі, культуры, адукацыі. Менавіта такое партнёрства паўплывала і на тэматычны «парадак дня» форума, склад яго ўдзельнікаў, у значнай ступені — на характар, тэматычныя абсягі выступленняў.

Адметна, што, як вынікае са старонак зборніка матэрыялаў, удзельнікі форуму звярнуліся і да памяці, і да вопыту папярэднікаў у краязнаўчай працы. Неаднойчы гучаць імёны доктара гістарычных навук Мікалая Улашчыка, доктара гістарычных навук, былога дырэктара Мінскага абласнога краязнаўчага музея Генадзя Каханоўскага, школьных настаўнікаў — арганізатараў краязнаўчай работы ў розных рэгіёнах Беларусі Алеся Белакоза, Віктара Арлова, Рыгора Родчанкі, Івана Шавеля...

Даклады, выступленні, змешчаныя ў зборніку, цікавыя яшчэ і таму, што з іх вынікае безліч сур'ёзных задач, якія трэба вырашыць у айчынным краязнаўстве ў найбліжэйшыя дзесяцігоддзі і нават у найбліжэйшыя гады. Праўда, наклад двухтомнага выдання — толькі 140 экзэмпляраў.

Матэрыялы падрыхтаваў Кастусь ЛЕШНІЦА.

Сабачы цырульнік

У нашы дні да хвастатых і вусатых гадаванцаў гаспадары ставяцца не менш уважліва, чым да ўласных дзяцей. І гэта датычыцца не толькі іх здароўя, але і знешняга выгляду. Мы даведаліся, што цяпер у модзе ў чатырохногіх франтаў, якія ёсць прафесійныя рызыкі ў стыліста па стрыжцы жывёл і колькі каштуе «звярыная прыгажосць».

Пра моду і крэатыў

Праца грумера сезонная. І зімой якраз «несезон». Наплыў кліентаў у стылістаў чатырохногіх — вясной (асабліва калі яна, як у апошнія гады, пачынаецца раптоўна, і гаспадары разумеюць, што іх сабакі пасля зімы выглядаюць не вельмі дагледжанымі) і ўвосень, пасля дачнага сезона. Коцікаў, дарэчы, прыводзяць у гэтую пару да стылістаў не радзей, чым сабак: вясновая і восеньская лінька вусатых-хвастатых пасля стрыжкі менш праблематычная. Цяпер, не ў сезон, у Крысціны Нічыпаровіч, грумера з амаль дзесяцігадовым стажам, у дзень звычайна не больш за два-тры кліенты.

— Калі я толькі пачынала працаваць, сабакі, ды і каты траплялі да мяне ў жахлівым стане. Асабліва ў канцы лета і пачатку восені, пасля таго, як правялі з гаспадарамі шмат часу на прыродзе, — распавядае Крысціна. — У даўгашэрсных былі самыя сапраўдныя дрэды, як у рэпераў: нават блохі ў іх не заводзіліся! Прывядзенне ў належны выгляд жывёлы пасля «летніх вакацый» займала не менш за два дні. Цяпер гаспадары лепш разумеюць патрэбы сваіх гадаванцаў, і паход да стыліста ўжо перастаў быць чымсьці «для элітных хатніх жывёл».

Сярод пастаянных кліентаў суразмоўніцы — у асноўным невялікія пароды сабак: ёркшырскія тэр'еры, балонкі, шпіцы, пудзелі, чыхуахуа і спаніэлі. Апошнім часам стала досыць шмат «двортэр'ераў»: іх гаспадары таксама хочуць, каб гадаванцы былі прыгожыя. Стрыжкі сабак бываюць выставачнымі — тут няма месца асабліваму крэатыву: выгляд некаторых пародаў не мяняецца стагоддзямі. Пэт-грумінг, або стрыжкі «для сябе», — вось поле, на якім праяўляюць крэатыў і гаспадары, і стылісты, дзе ёсць месца модзе. Але і тут існуюць пэўныя абмежаванні. Напрыклад, ёсць пароды, прадстаўнікоў якіх нельга стрыгчы «налыса»: поўсць потым можа не вырасці наогул.

— Для пудзеляў існуе пяць класічных стрыжак: папі, леў, спартыўная, стрэч, настальжы (не лічачы розных варыяцый на іх тэмы). У рызеншнаўцараў класікай лічыцца «Шапачка Папы Рымскага». Акрамя стрыжкі, многім пародам патрабуецца трымінг — выскубанне поўсці (неабходна тэр'ерам) або спалучэнне трымінгу і стрыжкі. Няма жорсткага эталона і ў стрыжцы катоў — толькі агульныя рэкамендацыі.

Што датычыцца моды, цяпер для дэкаратыўных пародаў сабак на піку папулярнасці так званы азіяцкі стыль. Гэтая мода нарадзілася ў Карэі, захліснула Еўропу і ў рэшце рэшт прыйшла да нас. Сутнасць яе ў тым, каб маленькіх сабак з дапамогай стрыжкі рабіць падобнымі на плюшавыя цацкі.

— Перад купаннем жывёла стрыжэцца як бы ў «чарнавым варыянце», — расказвае Крысціна. — Потым — сушка фенам і завяршэнне стрыжкі.

Стандартная стрыжка для коцікаў — «леў»: галаву пакідаюць калматай, не чапаюць ніжнюю частку лапак і кончык хваста. Астатнюю поўсць выдаляюць пад машынку (застаецца прыкладна 2 мм даўжыні). У сярэднім, комплекс паслуг займае дзве гадзіны: стрыжка, чыстка зубоў і вушэй, абрэзка кіпцяў.

Крэатыў звычайна датычыцца сабак: каты прыгожыя і так, да таго ж з'яўляюцца значна больш нервовымі кліентамі: фамільярнасці яны не пацерпяць. Максімум — згадзяцца на выбрыты ўзор на спінцы або хвасце. А вось сабакі гатовыя пацярпець дзеля таго, каб гаспадар быў задаволены. Асабліва разыгрываецца творчае ўяўленне гаспадароў перад Новым годам, распавядае Крысціна. Любімцам і вушкі ўпрыгожваюць бліскаўкамі, і рознакаляровы нейл-дызайн заказваюць. Але часам варта спыняць гэты вір крэатыву, таму што галоўная запаведзь грумера, як і лекара, — «Не нашкодзь!»

Прыгажосць — страшная сіла

Ёсць пароды, якія стрыгчы трэба абавязкова: адрастаючы, поўсць негатыўна ўплывае на здароўе гадаванцаў. Напрыклад, у пудзеляў «зарастаюць» вочы, і жывёла пачынае дрэнна бачыць. Іншыя пароды (з кароткай поўсцю) у стылісце аб'ектыўна не маюць патрэбы — гэта проста жаданне гаспадароў зрабіць жывёлу прыгожай.

У маёй суразмоўніцы ветэрынарная адукацыя. Да любові да жывёл дадалося захапленне модай — і ў выніку Крысціна скончыла курсы грумінгу. І з тых часоў пастаянна ўдасканальвае свае веды і ўменні. Для грумера вельмі важныя ветэрынарныя веды, кажа яна. Кожная стрыжка павінна пачынацца з агляду: хворую жывёлу стрыгчы нельга.

Прафесійныя рызыкі грумераў досыць сур'ёзныя: далёка не ва ўсіх хвастатых «кліентаў» ёсць прышчэпкі. Ну і, вядома, ніводнаму грунаморднік Крысціна лічыць крайняй мерай. Галоўнае — даць жывёле зразумець, што стыліст яму сябар, а не вораг. І тут вельмі важныя добразычлівасць і вера ў свае сілы.

— У мяне ёсць пастаянны кліент — персідскі кот з арыстакратычнай радаслоўнай. Ён павінен быць белы, але на нервовай глебе перыядычна жаўцее: становіцца светла-бурым. А душэўная арганізацыя ў яго тонкая: любая дробязь выводзіць яго з сябе, і ён жоўкне. Яго я купаю ў палатняным мяшэчку, завязаным пад падбароддзем. Поўсць выдатна

меру не ўдалося пазбегнуць драпін і ўкусаў. Аказваецца, каціныя ўкусы страшнейшыя за сабачыя з-за спадарожных інфекцый, выкліканых бактэрыямі, што глыбока пранікаюць у тканіны ў момант укусу.

— Небяспека ўкусаў кошак абумоўлена асаблівасцямі пабудовы іх зубоў. Сабачыя зубы не такія вострыя і не пранікаюць занадта глыбока. Каціныя ўкусы нагадваюць укол. Каты глыбока пракусваюць тканку, заносячы бактэрыі ў суставы і сухажыллі, — тлумачыць суразмоўца.

Да таго ж кошкі, як ужо гаварылася, значна менш лаяльныя да майстра. У прынцыпе, для грумераў створаны спецыяльныя прыстасаванні, каб засцерагчыся падчас працы, але той жа прамываецца, затое ад кіпцюроў я абароненая.

Наогул, ні сабакі, ні кошкі, калі псіхіка ў іх у раўнавазе, не маюць моцнага паху. «Катамі смярдзіць» у кватэры, дзе жывёлу нешта непакоіць або расстройвае...

Кошт візіту да «звярынага стыліста» пачынаецца ад 50—70 рублёў.

— Кошт залежыць ад многіх фактараў, — тлумачыць Крысціна. — У тым ліку ад памераў жывёлы: чым яна большая, тым даражэй будзе яе пастрыгчы. Пры гэтым многія пароды маюць патрэбу ў паслугах цырульніка не радзей, чым раз на два месяцы. Акрамя таго, правільная стрыжка дапамагае схаваць недахопы экстэр'ера. Напрыклад, у мяне ёсць пастаянны кліент кокер-спаніэль: у яго ўсё ідэальна, але «падкачалі» вуглы задніх канечнасцяў. Я стрыгу яго так, каб гэтага не было відаць. У цэлым паслугі грумера абыдуцца прыкладна ў тую ж суму, што і наведванне цырульніка ў чалавечым салоне прыгажосці, — цэны супастаўляльныя.

— А як часта трэба наведваць грумера?

— Гэта залежыць у першую чаргу ад пароды. Але і ад гаспадара таксама. У сярэднім, хадзіць да грумера трэба раз на тры месяцы. Але калі гаспадары падтрымліваюць стрыжку ў хатніх умовах, перапынак паміж візітамі можа складаць і каля паўгода.

— Ці звяртаюцца да стыліста гаспадары іншых хатніх жывёл?

— Гэтым летам я стрыгла ангорскага хамячка. Яму было горача, прыйшлося падстрыгчы яго «пад машынку».

Выхад у свет

Выставы сабак і катоў ніхто не адмяняў і зімой. А значыць, грумерам без працы сядзець не давядзецца. Рыхтуюць жывёл да выставы толькі вопытныя грумеры, прычым у іх ёсць спецыялізацыя: як правіла, такія майстры спецыялізуюцца на пэўных пародах сабак.

— Падрыхтоўка да выставы — неверагодна адказная задача. Любая памылка можа паўплываць на рашэнне журы.

Звычайна падрыхтоўка да выставы ў жывёл светлай афарбоўкі пачынаецца за два тыдні, цёмнай — за тры. Але часта — значна раней. Напрыклад, існуе метад ролінгу — шматслойнага абрастання поўсцю: майстар вышчыпвае поўсць у шахматным парадку раз на месяц-два. Графік наведванняў трэба дакладна выконваць. Але ў выніку мы атрымліваем неверагодна шаўкавістую, густую поўсць, якая выдатна ўкладваецца пры дапамозе расчоскі і фена.

— Калі поўсць кучаравіцца, а павінна быць прамой, прымяняецца тэмпературнае ўздзеянне на кончыкі поўсці ў спалучэнні з вычэсваннем. Перад выставай выцягваю фенам кожную пасмачку. Шмат марокі з пушыстымі пародамі. Трэба, скажам, гадаванцу быць калматым, і ён усім прыгожы, а вось поўсцю — не. Значыць, яе перад выставай можна начасаць, — расказвае Крысціна. — Ёсць яшчэ такая хітрасць: на гадаванца апранаюць камбінезон супраць шэрсці і здымаюць непасрэдна перад паказам.

Наогул, выставачных «хітрасцяў» дастаткова шмат, кажа суразмоўца.

— Афарбоўкай жывёл сёння нікога не здзівіш. Таніруюць сабак і катоў, каб надаць воўне больш яркія, бліскучыя адценні. А часам — каб схаваць недахопы натуральнай афарбоўкі. Ёсць адценневыя гелі і шампуні для жывёл, але асабіста мне больш падабаецца працаваць «чалавечымі». Так бы мовіць, праверана на сабе. Купаю ў дзіцячых бессульфатных шампунях, для ўкладкі выкарыстоўваю гелі і лакі моцнай фіксацыі. Фарбую «L'oreal», дробныя дэфекты афарбоўкі хаваю з дапамогай «макіяжу» — алоўкам для броваў або тушшу для павек. Першае таніраванне робіцца за месяц да выставы. Потым шэрсць афарбоўваецца паўторна. Апошні штрых — воцатная вада, якой да бляску нацiраецца шэрстка. Таксама перад выставай стылісты пакрываюць жывёле кіпцюры лакам — бясколерным, для бляску.

Звычайна сабакі, як вялікія, так і маленькія, пакорліва пераносяць усе неабходныя працэдуры. Вось з коцікамі так проста «дамовіцца» не ўдаецца...

— Для жывёлы першая выстава — гэта стрэс. «Суродзічы», пахі, нервовасць гаспадароў, нязручнасці: да выступлення (а гэта можа быць гадзіна і больш) гаспадары не дазваляюць ні сесці, ні легчы, каб не парушыць укладку. Але паступова выставы становяцца для жывёл радаснай падзеяй: «Я найлепшы, мной захапляюцца, гаспадар мной ганарыцца!» Большасць сабак, якія ўжо ацанілі радасць перамог на выставах, без раздражнення аддаюць сябе ў рукі цырульніка. Каты ж пакусаюць і падрапаюць. Ціхмянымі становяцца толькі перад самым паказам — дазваляюць і поўсць распушыць, і страсянуць сябе, як каўнер, акуратна ўтрымліваючы за пярэднія і заднія лапкі.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

ЛОТ 1: право заключения договора аренды сроком 3 года части помещения площадью 2,0 кв. м по адресу: г. Гродно, ул. Буденного, 37.
Размер ежемесячной арендной платы: 2,0 базовых арендных величин.
Условия проведения аукциона: размещение рекламного поля (2-х световых панелей).
Начальная цена продажи объекта – 8,93 руб. (восемь рублей девяносто три копейки) с учетом НДС.
Сумма задатка – 0,89 руб. (восемьдесят девять копеек)

Продавец – УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги» объединенная станция Гродно, 230023, г. Гродно, ул. Буденного, 37, тел. 8-0152-73-43-52, факс 8-0152-72-24-58

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70

Условия расчетов и заключения договора аренды.
- срок подписания договора аренды – 10 рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона с представлением копии платежных документов перечисления суммы за право заключения договора аренды,
- срок оплаты – 3 рабочих дня с даты подписания протокола о результатах аукциона (но до заключения договора аренды)

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 29 января 2021 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 27 января 2021 г. до 15.00

Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2021.Б.002.00001

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов по продаже имущества, принадлежащего Обществу с ограниченной ответственностью «ВТП», УНП 391418293, в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 13-9Б/2020 в экономическом суде Витебской области.

Номер лота, вид выставляемого на электронные торги имущества:
Лот № 1: недвижимое имущество.

Капитальное строение с инвентарным номером 200/С-45411, расположенное по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 39-й Армии, площадь – 113,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – проходная большая, составные части и принадлежности: тамбур.

Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 240100000003000352, общей площадью 1,9682 га, предоставленном в общее долевое право аренды, доля Общества с ограниченной ответственностью «ВТП»: 1/100.

Начальная цена: 37 700,00 бел.руб. без НДС.

Минимальная цена: 22 620 белорусских рублей без НДС.

Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.

Имеющиеся обременения в отношении имущества: нет.

Дата и время начала и завершения электронных торгов: 29.01.2021 с 9.00 до 16.00.

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке Коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу http://etpvit.by.

Для участия в электронных торгах на электронной торговой площадке по электронному адресу http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок до 16.00 28.01.2021.

Задаток по лоту № 1 в сумме 3 770,00 (три тысячи семьсот семьдесят рублей, 00 копеек) должен быть зачислен на счет коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 5 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.

Справочная информация:
Контактный телефон антикризисного управляющего: +375 29 711-43-22.
Контактный телефон для осмотра объектов: + 375 29 711-43-22.
Контактный телефон лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 42-60-11, 8 (029) 884-96-79.

Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов (информацией о предмете электронных торгов – в отношении нематериальных активов) с 29.12.2020 по 28.01.2021 с 09.00 до 17.00 по месту нахождения имущества по предварительному согласованию.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно сметы затрат и прейскуранта ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by до начала торгов.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ООО «Завод автомобильных прицепов и кузовов «МАЗ-Купава», г. Минск, ул. Машиностроителей, д. 18**
Предмет аукциона	
Административно-бытовой корпус № 2 с проходной (назначение: здание административно-хозяйственное, об. пл. 304,1 кв. м, 500/С-39010). Месторасположение**: г. Минск, ул. Машиностроителей, 18/1**	
Сведения о земельном участке: пл. **0,0656 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 28.02.2025) для обслуживания здания административно-хозяйственного. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения (пл. 0,0195 га)	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 133 200,00 долларов США	
**Примечание: цена продажи Предмета аукциона фиксируется в протоколе о результатах аукциона в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения аукциона)*	
Задаток в сумме 30 000,00 бел. руб. перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета аукциона	
Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Дата и время проведения аукциона: 15.02.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 12.02.2021 до 17.00** по указанному адресу	

Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

ПОВТОРНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ КРЕДИТОРОВ
ОАО «Трест Белтрансстрой»
по вопросу направления в экономический суд. г. Минска ходатайства о продлении установленного срока санации до июля 2021 г., **состоится 04.01.2021 в 10.00** по месту расположения ОАО «Трест Белтрансстрой» по адресу: г. Минск, ул. Советская, 8.

УНП 100120922

Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко»

(место нахождения: 222201, Минская обл., Смолевичский р-н, г. Смолевичи, ул. Социалистическая, д. 54, к. б) сообщает о том, что 22.12.2020 Общим собранием акционеров было принято решение о заключении сделки, в совершении которой имеется заинтересованность аффилированного лица, – лицензионный договор с совместным закрытым акционерным обществом «Серволюкс». Предмет сделки – права и разрешение на использование на всей территории Республики Беларусь на срок с 01 января 2021 года по 30 сентября 2027 года включительно за вознаграждение на условиях простой (неисключительной) лицензии следующих товарных знаков:

	Обозначение (изображение товарного знака (знака обслуживания)	Номер регистрации/ свидетельства	Дата регистрации в гос. реестре ТЗ и ЗО РБ	Классы МКТУ (товары и/или услуги)
1	servolux PROFESSIONAL	65047	13 мая 2019 года	29, 30, 32, 33, 35, 43

Совместное закрытое акционерное общество «Серволюкс» является аффилированным лицом закрытого акционерного общества «Смолевичи Молоко» на основании абзаца 2 части 1 статьи 56 Закона Республики Беларусь от 09.12.1992 № 2020-XII (ред. от 17.07.2017) «О хозяйственных обществах».

Размер лицензионного вознаграждения за права, предоставляемые на срок действия договора, – 104 287,50 (сто четыре тысячи двести восемьдесят семь рублей 50 копеек) белорусского рубля, в том числе НДС по ставке 20 % – 17 381,25 (семнадцать тысяч триста восемьдесят один рубль 25 копеек) белорусского рубля.

Балансовая стоимость активов по состоянию на 30.11.2020 составляет – 16 530 000 (шестнадцать миллионов пятьсот тридцать тысяч) белорусских рублей.

УНП 690668083

УНП 700049607

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» сообщает о переносе внеочередного собрания акционеров с 21 января 2021 года на 26 января 2021 года».

РУП «Торговый дом «Восточный»

извещает о проведении 14.01.2021 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-7094243 общей площадью 190,1 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Социалистическая, д. 26, пом. 2. Назначение: помещение здравоохранения, наименование – помещение здравоохранения. **Начальная цена продажи – 93 798,00 рубля, задаток – 9 379,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 2. Изолированное помещение с инвентарным номером 130/D-24524 общей площадью 49,0 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Пинск, ул. Первомайская, 142-172. Назначение: квартира; наименование: квартира. **Начальная цена продажи – 47 871,00 рубля, задаток – 4 787,10 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 3. Капитальное строение с инвентарным номером 611/С-19573 общей площадью 753,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Мультана, д. 106. Назначение: здание неустановленного назначения, наименование: цех мешкоопилок. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 620450100001000084 площадью 5,8422 га. **Начальная цена продажи – 34 646,40 рубля, задаток – 3 464,64 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 4. Земельный участок с кадастровым номером 321081600009000030 площадью 0,0922 га, расположенный по адресу: Гомельская обл., Гомельский р-н, Грабовский с/с, сад. тов-во «Ягодка», 45. Целевое назначение: земельный участок для коллективного садоводства. **Начальная цена продажи – 1 458,00 рубля, задаток – 145,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 5. Изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-103355 общей площадью 95,8 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Октябрьский 3-й, 7А-10. Назначение: квартира, наименование: квартира № 10 *(число комнат – 3, этаж – 4, год постройки – 2011)*. **Начальная цена продажи – 131 760,00 рубля, задаток – 13 176,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 6. Машино-место № 18 с инвентарным номером 500/D-798201861 общей площадью 12,5 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Радищева, 3-161. Назначение: машино-место, наименование: машино-место. **Начальная цена продажи – 9 936,00 рубля, размер задатка – 993,60 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 7. Капитальное строение с инвентарным номером 410/С-1670 общей площадью 105,4 кв. м, расположенное по адресу: Гродненская обл., Волковысский р-н, г. Волковыск, ул. Госпитальная, 11/18. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад продовольственный. Составные части и принадлежности: подвал под зданием. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 420850100001010158 площадью 0,4031 га. **Начальная цена продажи – 1 395,00 бел. рубля, размер задатка – 139,50 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 8. Незавершенное незаконсервированное капитальное строение с инвентарным номером 700/U-, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, пер. Слободской, 14. Наружная площадь (площадь застройки) – 125 (166) кв. м. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 740100000004002010 площадью 0,1288 га. **Начальная цена продажи – 140 480,00 бел. рубля, размер задатка – 14 048,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 9. Земельный участок с кадастровым номером 620480408601000073 площадью 0,2500 га, расположенный по адресу: Минская обл., Березинский р-н, Березинский с/с, д. Тростянка, ул. Советская, д. 9. Целевое назначение: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома). **Начальная цена продажи – 2 610,00 бел. рубля, размер задатка – 261,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 10. Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-29105 общей площадью 75,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Пинский р-н, Логишинский с/с, д. Ковнятин, ул. Советская, 47. Назначение: здание одноквартирного жилого дома; наименование: одноквартирный жилой дом. Составные части и принадлежности: один деревянный сарай. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 125475504601000167 общей площадью 0,1800 га. **Начальная цена продажи – 1 485,00 бел. рубля, размер задатка – 148,50 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 11. Единый объект недвижимого имущества в составе:

1. Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-51596 общей площадью 4 416,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 100К. Назначение: сооружение специализированное транспорта; наименование: площадка для подготовки водителей автотранспортных средств (автодром). Составные части и принадлежности: покрытие, основание, эстакада. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002152 площадью 0,4852 га.

2. Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-51597 общей площадью 540,0 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орджоникидзе, 100К. Назначение: забор кирпичный; наименование: забор кирпичный. Составные части и принадлежности: заполнение, столбцы, цоколь. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000007002152 площадью 0,4852 га.

Начальная цена продажи – 50 112,00 бел. рубля, размер задатка – 5 011,20 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.

Лот № 12. Земельный участок с кадастровым номером 424385700001000060, с учетом имущественных прав на него, площадью 0,1134 га, расположенный по адресу: Гродненская обл., Новогрудский р-н, Волковичский с/с, СТ «Берёзка», д. 11. **Начальная цена продажи – 1 270,08 бел. рубля, размер задатка – 127,01 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 13. Капитальное строение с инвентарным номером 243/С-9982, общей площадью 41,4 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Толочинский р-н, г. Толочин, ул. Мелиораторов, 1А/2. Назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель; наименование: столярный цех. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 224650100001000661 площадью 0,9521 га. **Начальная цена продажи – 2 448,00 бел. рубля, размер задатка – 244,80 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 14. Капитальное строение с инвентарным номером 140/С-30852 общей площадью 131,9 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Кобрин, ул. Пролетарская, 172А. Назначение: здание специализированное коммунального хозяйства; наименование: здание котельной. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 124350100002004569 площадью 0,2383 га. **Начальная цена продажи – 9 000,00 бел. рубля, размер задатка – 900,00 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 15. Капитальное строение с инвентарным номером 713/С-9197, общей площадью 46,1 кв. м, расположенное по адресу: Могилевская обл., Кличевский р-н, Долговский с/с, д. Долгое, ул. Заречная, д. 60. Назначение: здание одноквартирного жилого дома; наименование: жилой дом. Составные части и принадлежности: одноэтажный бревенчатый жилой дом с холодной пристройкой, тремя сараями. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 723081603101000164 площадью 0,0514 га. **Начальная цена продажи – 1 814,40 бел. рубля, размер задатка – 181,44 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

Лот № 16. Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-644549 общей площадью 17,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Лобанка, д. 101, пом. 24. Назначение: помещение транспортного назначения – гараж; наименование: гараж № 24. **Начальная цена продажи – 12 052,80 бел. рубля, размер задатка – 1 205,28 бел. рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляется в соответствии с действующим законодательством РБ.

3. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте **konfiskat.by** в разделе «Недвижимость».

Аукцион состоится 14.01.2021 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318, зал для аукционов.

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Жилуновича, 15, офис 318 (управление реализации недвижимости и арендных отношений) в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.

Окончание приема заявлений – 11.01.2021 в 15.00.

Задаток перечисляется на р/с BY07 MMBN 3012 0000 0101 0165 3934, БИК MMBNBY22, в ОАО «Банк Дабрабыт», г. Минск, ул. Коммунистическая, 49, пом. 1, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), Лот №___, проводимом **14 января 2021 года.**

Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменному указанию Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным.

Контакты организатора аукциона: +375 17 378 87 02; +375 17 378 87 03; +375 44 763 62 63.

Максім ТАРНАПІЦКІ.

ЛЕКСІКА ПАЛЕССЯ:

як фатографы візуалізуюць ідэнтычнасць беларусаў

«Прыпяць, або «припечь» — старая назва, якая яшчэ захавалася ва ўжытку на мясцовасці, азначае пясчаны нанос сярод ракі».

Спалучэнне ўнікальных слоў і ўнікальных пейзажаў... Прырода як падтэкст мовы... Культурніцкі цэнтр «Корпус» у фармаце open-air праводзіць фотавыстаўку «Лексіка Палесся». Вы гледзіце на ручнікі, прыдарожныя крыжы, дзівосныя рэкі і птушак — і чуеце старадаўнія словы, якія ўсё гэта суправаджаюць... Спасцігаеце таямнічае, загадкавае Палессе, якое ўразіла і Купрына, і Караткевіча...

Дар'я САПРАНЕЦКАЯ.

Работы ўмоўна падзелены на тры катэгорыі: экалагічную, этнаграфічную і антрапалагічную. Відавочна, што пытанне экалагічнага стану Палесся стаіць вельмі востра. Па-першае, паўплывала меліярацыя рэгіёна, якая праводзілася ў 60-х гадах мінулага стагоддзя. Гэта сказалася на ўзроўні вады ў рэках. Прыпяць, вядомая ўсім беларусам рака, пачала мялець. І, канешне ж, аварыя на Чарнобыльскай АЭС, з наступствамі якой даводзіцца працаваць нават цяпер. Чорны цень чароўнага краю...

З тэмай далікатнай экасістэмы Палесся працуюць фатографы Уладзімір Карэлін, Аляксандр Сідарэўскі і Таццяна Внучка. Яны асэнсоўваюць адну з найбольш адчувальных траўм беларусаў.

Этнаграфічны складнік «Лексікі Палесся» прадстаўлены работамі Дар'і Сапранецкай і Марыі Мароз. На фотаздымках захаваны імгненні вясковага жыцця: народныя святы, жыхары палескіх вёсак. Некаторым бабулям і дзядулям споўнілася амаль па сто гадоў. Фіксуючы прыдарожныя крыжы, ручнікі і самаробныя плеценыя капелюшы, аўтары візуалізоўваюць нацыянальны культурны код.

Апошняя катэгорыя здымкаў — антрапалагічная, якая адлюстроўвае ўзаемадзеянне чалавека з прыродай. Напрыклад, здымак Івана Восіпава: ён сфатаграфаваў спадчыннага бортніка Васіля, які дастае з калоды-вулля сцельнікі з лясным мёдам. Або серыя здымкаў Аляксея Мацюшкова, якая расказвае гісторыю вёскі Снядзін, куды няма дарогі: тая проста сыходзіць пад ваду падчас вясновай паводкі.

Вельмі цягне назваць выстаўку паэтычнай і кранальнай. Аднак, акрамя гэтага, «Лексіка Палесся» выконвае вельмі шмат важных функцый. Прадстаўленыя работы — гэта рэфлексія і асэнсаванне культурных траўм; фіксаванне былой і пошук новай ідэнтычнасцяў беларусаў; паставоўка пытання аб экалагічных праблемах краю.

Праект арганізаваны пры дапамозе грамадскай арганізацыі аховы дзікай прыроды «Багна» і арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны». Удзел у выстаўцы прынялі як знакамітыя беларускія фатографы, так і самі палешукі. Пабачыць экспанаты можна будзе ў дварэ «Корпуса» да 31 снежня.

Арына КАРПОВІЧ.

Максім ТАРНАПІЦКІ.

Шануй сваё

ГОЛАС І ФУНДАМЕНТ НАЦЫІ І АСОБЫ

Новы «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» будзе налічваць 250 тысяч слоў. У папярэднім было 97 тысяч

Творы сучасных аўтараў і класічная літаратурная спадчына спрыяюць кансалідацыі грамадства, уплываюць на фарміраванне і развіццё асобы. Літаратура вучыць чалавека крытычнаму мысленню, узбагачае беларускую мову і садзейнічае яе захаванню. Такія думкі агучылі ўдзельнікі нядаўняй прэс-канферэнцыі «Мова беларускіх класікаў і грамадства web.4.0: узаемадзеянне і трансфармацыя, папулярызацыя ў СМІ».

— Культура, мова, літаратура, гуманітарная сфера, навука, адукацыя заўсёды застаюцца стрыжнем існавання і функцыянавання дзяржавы і развіцця грамадства. Я хачу сказаць, што наша класіка не вычэрпваецца толькі ўласна класічнай спадчынай, дзе творы Якуба Коласа, Янкі Купалы, Багдановіча і іншых. Класічныя традыцыі вельмі актыўна працягваюцца і ў нашай сучаснай беларускай літаратуры. І ў беларускамоўнай, і ў рускамоўнай, — адзначыў **дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы, доктар філалагічных навук Іван САВЕРЧАНКА.** — Калі браць сучасных аўтараў, то я, назіраючы іх грамадзянскую пазіцыю, бачу, што яны нацэлены на кансалідацыю грамадства, на стваральную працу. У гэтым і заключаецца пісьменніцкая місія. Мы часам гэтага не заўважаем, але менавіта літаратура, прыгожае пісьменства ўплываюць на сталенне чалавека, на фарміраванне яго светапогляду. І, нарэшце, мы жывём у такім глабальным свеце, дзе літаратура выступае важным чыннікам міжнароднага дыялогу. Нехта можа наведаць іншую краіну, а многія даведваюцца пра суседзяў менавіта праз літаратурныя творы. Таксама і праз нашы творы народы з іншых краін даведваюцца пра жыццё, праблемы, здабыткі Беларусі. Літаратура — той падмурак, на якім адбываецца і павінна адбывацца яднанне народа ў адзіную сям'ю.

У сваю чаргу **дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Ігар КАПЫЛОЎ** адзначыў, што сёння вельмі актуальна гучыць тэма папулярызацыі мовы класікаў і захавання мовы ў цэлым не толькі для нашай краіны, але і для ўсёй сусветнай супольнасці. Пра гэта сведчаць шматлікія форумы, канферэнцыі, дзе спрабуюць знайсці вырашэнні вучоныя з розных краін свету. Чаму гэта так важна?

— Мова кожнага народа з'яўляецца ўнікальным інструментам для разумення і апісання навакольнага асяроддзя, важным сродкам камунікацыі, перадачы ведаў. Уяўляе сабой своеасаблівае сховішча гістарычнага і сацыяльнага вопыту нацыі. Выступае ў якасці фактару цэнтралізацыі і сродку самаідэнтэфікацыі чалавека. Увогуле без нацыянальнай мовы не могуць існаваць нацыя і дзяржава. Нягледзячы на гэта, амаль палова моў свету, па даных ЮНЕСКА, сёння знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Многія мовы страчваюць сваё значэнне ў разнастайных сферах грамадскага жыцця, уключаючы навуку, культуру, СМІ, палітыку, справаводства, бізнес і турызм, — адзначыў Ігар Капылоў. — 600 моў знікла на працягу XX стагоддзя. І на жаль, гэтыя працэсы працягваюцца. Калі яны будуць і далей працягвацца, то, паводле песімістычных прагнозаў ЮНЕСКА, можа знікнуць каля 90 % існуючых моў.

На думку навукоўца, да асноўных выклікаў сучаснасці, якія аказваюць істотны ўплыў на сітуацыю з мовамі, адносяцца працэсы глабалізацыі, размыванне культурных межаў, страта культурных адрозненняў. Таксама негатыўна на нормах літаратурнай мовы на розных узроўнях сказваюцца лібералізацыя адукацыі, развіццё сацыяльных сетак і публічнай інфармацыйнай прасторы. Сёння ўзнікла прынцыпова новае інфармацыйнае асяроддзе. Але адсутнічаюць аўтарытэты, нормы і межы самавыказвання. І тут важна памятаць, што страта нацыянальных моў вядзе не толькі да страты традыцыйнай духоўнай спадчыны, пераемнасці ведаў, але і да страты сусветнай культурнай разнастайнасці. Менавіта праца пісьменнікаў і папулярызацыя іх творчасці ў СМІ адыгрываюць выключна важную ролю ў развіцці беларускай мовы і станаўленні яе норм. Не меншы ўплыў на папаўненне лексічнага складу і вызначэнне моўных норм аказвае публіцыстыка.

— Актуальнымі застаюцца працэсы неалагізацыі і запазычвання слоў. Напрыклад, новы Тлумачальны слоўнік, першы том якога ў Інстытуце мовазнаўства плануюць выдаць ужо ў наступным годзе, будзе налічваць прыкладна 250 тысяч слоў — вельмі добрае таму пацверджанне, бо папярэдні пяцітомны слоўнік змяшчае крыху больш за 97 тысяч слоў. Калі разглядаць у параўнанні, то нават Оксфардскі слоўнік налічвае 190 тысяч слоў літаратурнай англійскай мовы, якая мае тысячагадовую гісторыю развіцця. Так што мова наша не бяднейшая, а нават багацейшая ў плане лексічнага складу, — кажа Ігар Лявонавіч. — Яшчэ я хацеў бы звярнуць увагу на вельмі важны аспект. Сёння вельмі важна наяўнасць мовы ў кіберпрасторы. Таму што прысутнасць у інтэрнэце — сёння гэта адна з асноўных умоў захавання і папулярызацыі мовы.

У гэтым кірунку ў беларускай мовы, на думку даследчыка, добрыя перспектывы, бо яна прысутнічае ў Вікіпедыях, у сацыяльных сетках, а таксама ў інтэрнэт-бібліятэках. Мовазнаўцы таксама робяць свой уклад: напрыклад, ствараюць электронныя версіі слоўнікаў. У Інстытуце мовазнаўства рыхтуюць яшчэ і Зводны зборнік беларускіх гаворак.

— Вывучэнне класічных узораў мастацкага слова з'яўляецца адным з найважнейшых этапаў літаратурнай адукацыі. Тым не менш час ад часу мы чуем пытанне, а навошта ж вывучаць класічную літаратуру? І ў адказ на яго я маю некалькі аргументаў. Па-першае, вывучэнне класічнай літаратуры — адзін з самых эфектыўных спосабаў развіцця моўнага інтэлекту. Ад чытання класічнай літаратуры развіваецца як актыўны, так і пасіўны слоўнікавы запас, таксама гэта спрыяе развіццю эрудыцыі, камунікатыўных навыкаў, самарэалізацыі асобы ў будучым. Па-другое, класічная літаратура — дзейсны сродак пазнання навакольля. Менавіта творы Коласа, Купалы, Багдановіча, Гарэцкага і іншых беларускіх класікаў дапамагаюць разумець, што ў свеце не існуе абсалютнай ісціны. Іх творы, якія абмяркоўваюцца ў школе, развіваюць крытычнае мысленне. Узоры класічнай літаратуры даюць мадэлі паводзін у розных сітуацыях. Праз класічную літаратуру закладваюцца культурныя коды разумення ўнутранага свету беларусаў. Гэта важны момант захавання самога сябе ў глабальным свеце, — падзяліўся падчас абмеркавання **начальнік упраўлення маніторынгу якасці адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Вячаслаў КАРАТКЕВІЧ.** — Складальнікі вучэбных праграм і аўтары вучэбна-метадычных матэрыялаў прыкладаюць максімум намаганняў для таго, каб праз класічную літаратуру наша будучае пакаленне навучылася крытычна мысліць, адчуваць смак прыгожага, атрымліваць асалоду ад стылю пісьменніка.

Як бачым, хоць праблемы і існуюць, але агульнымі намаганнямі іх можна вырашыць. І тым самым пасадзейнічаць захаванню і развіццю беларускай мовы і яе прысутнасці ў сусветнай культурнай і інфармацыйнай прасторы.

Алена ДРАПКО.

Кадр з кінафільма «Лясная быль», забаронены Галоўрэперткамам БССР у канцы 1930-х гадоў.

ЗАБАРОНЕНАЕ КІНО:

Асабліва разлавалі экспертаў апошнія словы

Кінематограф у СССР лічыўся галоўным з усіх мастацтваў, партыйныя ідэолагі надавалі яму значэнне найважнейшага сродку выхавання і прапаганды. Кінавытворчасць у БССР, з аднаго боку, знаходзілася пад кантролем саюзна-рэспубліканскага Міністэрства кінематаграфіі, з другога — кантралявалася беларускім і агульнасаюзным партыйнымі кіраўніцтвамі.

Там выносіўся канчатковы прысуд сцэнарыям і гатовай кінапрадукцыі, прынятай мастацкім саветам кінастудыі «Беларусьфільм». Удзел Галоўліта БССР у працэсе цэнзуравання кінапрадукцыі абмяжоўваўся кантролем сцэнарыяў і ў асобных выпадках зманціраванага матэрыялу дакументальных фільмаў.

17 снежня 1924 года было створана Дзяржаўнае ўпраўленне па справах кінематаграфіі і фатаграфіі «Белдзяржкіно», якое мела манапольнае права на пракат фільмаў на тэрыторыі рэспублікі. Яно ж давала дазвол на кіназдымкі ўнутранага жыцця БССР па ўзгадненні з НКУС. Адначасова са стварэннем «Белдзяржкіно» пры агітацыйна-прапагандысцкім аддзеле ЦК КП(б)Б паўстаў кінакамітэт, які акрамя арганізацыйных і тэхнічных пытанняў разглядаў і зацвярджаў змест сцэнарыяў. Напрыклад, са сцэнарыя кінахронікі БССР за 1925 год членамі камітэта быў выкраслены сюжэт пра прызначаных адказных работнікаў. Выклікаў пытанні сюжэт пра ліквідацыю ў Мінску старых яўрэйскіх могілак і брукаванне вуліц магільнымі плітамі.

З 46 фільмаў 18 былі забаронены

Палітычны кантроль кінавытворчасці ўзмацніўся пасля партыйнай нарады па пытаннях кіно, якая адбылася ў лютым 1928 года. Спробы адыходу ад звыклых агітацыйна-прапагандысцкіх стэрэатыпаў адразу ж выклікалі негатыўную рэакцыю цэнзуры. Так было з гісторыка-рэвалюцыйным фільмам «Першы ўзвод», знятым Корш-Саблiным у 1932 годзе, і карцінай аб сучаснасці «Двойчы народжаны» (рэжысёр — Аршанскі, 1933 год). Не ўбачылі шырокага экрана сатырычныя стужкі «Хамелеон» (рэжысёр — дэбютант Леўшын, 1930 год), «Інжынер Гоф» (рэжысёры — Шпіс і Мільман, 1935). Фільм «Салавей» паводле вядомай аповесці Змітрака Бядулі (рэжысёр — Аршанскі, 1937 год) — адзіная экранізацыя твора беларускай літаратуры ў 1930-я гады — быў забаронены загадам Дзяржаўнага ўпраўлення кінематаграфіі СССР. І толькі пасля шматлікіх зваротаў «Белдзяржкіно» ў Маскву фільм дазволілі да паказу толькі ў беларускім рэспубліканскім кінапракаце. Гераіка-рэвалюцыйнаму фільму «Балтыйцы» саюзны Галоўрэперткам доўгі час не адважваўся выдаць пашпарт. Маскоўскіх цэнзараў стрымлівалі сумненні адносна таго, як у беларускай карціне быў выведзены вобраз Сталіна. У 1939 годзе агітацыйна-прапагандысцкі аддзел ЦК КП(б)Б з-за эпізода, дзе гераіня крыўдзіць героя-стаханаўца, уключыў у катэгорыю «не рэкамендаваных да прагляду» фільм Корш-Сабліна «Маё каханне». Партыйных ідэолагаў не спыніла тое, што да таго часу фільм карыстаўся надзвычайнай папулярнасцю ў СССР, а яго ардэнаносны рэжысёр, лаўрэат Сталінскай прэміі, з'яўляўся мастацкім кіраўніком беларускай кінастудыі.

У адной з найлепшых на той час стужак — «Двойчы народжаны» з Крыловічам у галоўнай ролі (рэжысёр — Аршанскі, сцэнарый Кобеца, 1933) замянілі 5-ю частку, прыбраўшы з яе партрэт «ворага народа», старшыні ЦВК БССР Чарвякова. Падобныя аперацыі праводзіліся над стужкамі «Вяртанне Натана Бекера» (рэжысёр — Шпіс, 1932), «Сосны шумяць» (рэжысёр — Малчанаў, 1928) і іншымі. Яшчэ большую работу па «кастрацыі» цэнзарам давялося зрабіць у кінахроніцы — знішчальныя нажніцы прайшліся па кожнай стужцы. У 1930-я гады шэраг беларускіх кінакарцін быў фізічна знішчаны. Так, не ўратавала імя заснавальніка беларускага кінематографа Юрыя Тарыча ад гэтага лёсу яго фільм пра дззерціра-чырвонаармейца «Уцекачы».

У жніўні 1937 года кіраўнік трэста «Белдзяржкіно» Конік паведаміў у Дзяржаўнае ўпраўленне кінематаграфіі ў Маскву, што з 46 мастацкіх фільмаў, створаных за дзесяць гадоў існавання беларускага кіно, 18 былі забаронены для паказу. Акрамя таго, былі «зняты» ўсе дакументальныя карціны для знішчэння «шкодных» кадраў.

Палескіх рабінзонаў мусіў паспяхова адшукаць райкам, а не паляўнічы Якуб

У жніўні 1946 года выйшла ініцыяваная сакратаром ЦК ВКП(б) Ждановым пастанова «Аб кінафільме «Вялікае жыццё», якая на доўгія гады закрыла шлях да экрана шэрагу карцін, а таксама паставіла тэму сучаснасці ў кіно на мяжу знікнення. Сталінская ідэя выпуску ў СССР невялікай колькасці мастацкіх фільмаў, але выключна кінашэдэўраў, а таксама барацьба з касмапалітамі, падчас якой пацярпела шмат кінадзеячаў, прывялі да рэзкага скарачэння кінавытворчасці ў краіне — да дзевяці фільмаў у год.

Меркавалася, што адным з падобных кінашэдэўраў у БССР павінна была стаць карціна «Канстанцін Заслонаў», работа над якой распачалася ў 1945 годзе. Ад пачатку гэты праект ішоў цяжка. З-за канфлікту на студыі рэжысёрам карціны адмовіўся быць Саннікаў. Калі мастацкі савет міністэрства кінематаграфіі БССР у 1948 годзе рэкамендаваў літаратурны сцэнарый Маўзона да пастаноўкі, і на яго была надрукавана станоўчая рэцэнзія ў партыйнай газеце «Культура и жизнь», да сакратара ЦК КП(б)Б Іоўчука звярнуўся былы намеснік камандзіра партызанскай брыгады імя Заслонава па разведцы Андрэеў. Ён, у прыватнасці, пісаў, што «...сцэнарый Маўзона «К. Заслонаў» з'яўляецца вынікам несур'ёзнага і глыбока памылковага стаўлення да гэтай важнай тэмы, ён скажае і не раскрывае перад гледачом маральна-палітычнае аблічча, буйны арганізацыйны і баявы талент легендарнага народнага беларускага героя».

Пасля зацвярджэння літаратурнага сцэнарыя некалькі варыянтаў «Канстанціна Заслонава» (аўтары — Корш-Саблін і Файнцымер) абмяркоўваліся (чытай — цэнзураваліся) на самым высокім узроўні — у ЦК КП(б)Б. У выніку гэтага з'явілася сцэна, дзе жыхары рэспублікі слухаюць прамову Сталіна 3 ліпеня 1941 года. Быў зроблены акцэнт на моцным супраціўленні Чырвонай Арміі ў першыя дні вайны, арганізаваную эвакуацыю прамысловасці. Нарэшце, сцэнарый «узбагаціўся» эпізодам, у якім Заслонава з заданнем на акупаваную тэрыторыю адпраўляе сакратар ЦК КП(б)Б. Гэтая міфалагізаваная версія сцэнарыя была адпраўлена для зацвярджэння ў Маскву загадчыку аддзела прапаганды і агітацыі ЦК ВКП(б) Шэпілаву і міністру кінематаграфіі СССР Бальшакову.

Пасля вяртання сцэнарыя з Масквы, у студзені 1949 года, Корш-Саблін быў вымушаны ўнесці ў яго новыя змены: 1. Замест сцэны ў кабінеце Сталіна была дадзена сцэна прыёму Заслонава сакратаром ЦК КП(б)Б. 2. Са слоў Заслонава адабраны разважанні пра «рэйкавую» вайну, каб у гледача не ўзнікла ўражанне, што ён быў ініцыятарам апошняй. 3. Выпраўлены ўсе месцы, дзе Заслонаў быў паказаны як недастаткова вопытны кіраўнік барацьбы з фашыстамі, а таксама эпізоды, дзе фашысты былі паказаны дурнямі. 4. Зусім адабраны ўсе размовы Заслонава з Хіртам пра нібыта хуткі захоп немцамі Масквы. 5. Вобраз кіраўніка партыйнага падполля Кораня паглыблены, узмоцнена сцэна, дзе ён па радыё даведваецца пра разгром немцаў пад Масквой. 6. Выпраўлена сцэна ў канцы фільма, дзе Заслонаў павольна сыходзіў на вачах у немцаў (у новай версіі ён адступаў ужо з боем).

Сцэнарый мастацкага фільма «Палескія рабінзоны» яго аўтар Блажэвіч таксама перарабляў некалькі разоў, прычым заўвагі мінскіх партыйных функцыянераў пераўзыходзілі па колькасці і абсурднасці прэтэнзіі маскоўскага кінаначальства. Так, аддзел прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б прапанаваў у 1948 годзе наступныя змены ў сцэнарый фільма: «Паказаць хоць бы ў некалькіх кадрах, як у глухія, адарваныя ад шырокіх дарог мядзведжыя куты Палесся пранікала савецкая культура...», «...як выконваецца дзяржаўны план па асушэнні Палескай нізіны», «...піянеры не павінны дасыпаць ліст-абавязацельства ў «Піянерскую праўду» дапамагчы навуковай экспедыцыі ў пошуку прыродных багаццяў без ведама сваіх кіраўнікоў», «...чаму райкам апынуўся бездапаможны ў пошуку зніклых піянераў, якіх па ўласнай ініцыятыве расшуквае паляўнічы Якуб» і да т. п.

Падчас экранізацыі аповесці «Трэцяя ракета» права ўмешвацца ў кінапрацэс мелі каля 60 чыноўнікаў

У пасляваенны пракат «трафейных» нямецкіх і (пераважна) амерыканскіх фільмаў трапляе традыцыя «кастрацыі» замежнага кіно ў СССР. Карціны скарачалі, пераіменоўвалі, здымалі з тытраў краіну вытворчасці. У арыгінальным выглядзе ў савецкім пракаце



Для служебного пользования

Экз. № 145

ПРИКАЗ

Нач. Главного Управления по делам литературы и издательств

(Главлит БССР)

№ 12 (2)

МИНСК — 1940 г.

Загад начальніка Галоўліта БССР.

не дэманстраваўся ніводны замежны фільм. Цэнзараў не задавальнялі эпізоды, якія, на іх думку, змяшчалі эротыку, жорсткасць, палітыку альбо не ўкладваліся ў часавыя пракатныя патрабаванні (паўтары гадзіны).

Абнаўленне савецкага кіно ў перыяд хрушчоўскай «адлігі» суправаджалася яго вяртаннем на міжнародную арэну, значным павелічэннем колькасці карцін і прыходам маладога пакалення творцаў. Лібералізацыя грамадскага жыцця, некаторыя цэнзурныя паслабленні, канешне, не азначалі адмену ідэалагічнага кантролю на такім важным участку, як кіно. У часы «адлігі» карціны ўжо не знішчалі, але іх марудна і цяжка прымалі на розных узроўнях, дзе аўтараў прымушалі зрабіць бясконцую колькасць правак. Менавіта ў гэты час з'явіўся феномен «паліцы», на якую фільм трапляў, калі яго непрымальнасць высвятлялася пасля здымак і мантажу.

Зачэпкі для цэнзурнага ўмяшання маглі быць розныя: ідэалагічныя памылкі, неадпаведнасць эстэтычным канонам сацрэалізму, афіцыйным уяўленням пра мараль, эміграцыя аўтараў або іх відавочная нядобранадзейнасць, нарэшце, абарона інтарэсаў зацікаўленых ведамстваў — ад сельскай гаспадаркі да космасу. Забарона гатовай карціны лічылася надзвычайным захадам, таму крамолу імкнуліся знішчаць у зародку, на ўзроўні сцэнарыя, а «памылковыя» эпізоды пераздымаць або выразаць.

У перыяд «адлігі» ў вытворчасці беларускіх фільмаў акрамя здымачнай групы «ўдзельнічалі» аддзелы прапаганды і агітацыі, а таксама культуры ЦК КПБ, Галоўліт БССР, ваенная цэнзура, Дзяржкамітэты па кінематаграфіі (беларускі і агульнасаюзны), сцэнарна-рэдакцыйная калегія і мастацкі савет кінастудыі, а таксама створаны ў 1962 годзе Саюз кінематаграфістаў БССР. Значная частка прадукцыі кінастудыі «Беларусьфільм» была прысвечана падзеям Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя карціны акрамя вышэйзгаданых інстанцый праходзілі цэнзураванне ў палітычным упраўленні Беларускай ваеннай акругі, а таксама ў Галоўным палітычным упраўленні Узброеных Сіл. У 1963 годзе Васіль Быкаў падчас здымак фільма па яго аповесці «Трэцяя ракета» (рэжысёр — Віктараў) падлічыў, што права ўмешвацца ў кінапрацэс мела каля 60 чалавек. Кожны з іх штосьці забараняў, змяняў, патрабаваў.

Старшыня Дзяржкіно БССР Паўлёнак асабіста кантраляваў працэс здымак «Альпійскай балады», папракаючы Васіля Быкава: «...збеглы з фашысцкага палону чырвонаармеец скардзіцца італьянцы на несправядлівасць сацыялістычнага ладу». Ад аўтара сцэнарыя фільма «Сыны ідуць у бой» Алеся Адамовіча ён патрабаваў, каб той прыбраў «...спачуванне да немчыкаў, якія церпяць ад рускіх марозаў».

Увесь склад сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі выступіў супраць Караткевіча

Галоўнай задачай, якую партыйнае кіраўніцтва ставіла перад кінагаліною ў пастанове, было камуністычнае выхаванне працоўных. Папулярнасць кіно не зніжалася (у 1962 годзе ў рэспубліцы было прададзена 115 млн квіткоў на кінасеансы), а гэта значыць, яно павінна было вырашаць выхаваўчыя задачы. У якасці аднаго з найважнейшых інструментаў ідэалагізацыі кіно аўтары пастановы паранейшаму бачылі прэвентыўную цэнзуру. Увосень 1962 года быў зацверджаны склад сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм», работа яе стала рэгулярнай. Галоўным рэдактарам калегіі стаў Аркадзь Куляшоў (неўзабаве яго змяніў Максім Лужанін). Адначасова павысілася адказнасць за ідэйна-мастацкую якасць прадукцыі мастацкага савета кінастудыі, які ўзначальваў дырэктар «Беларусьфільма» Дорскі.

Першапачаткова органы прэвентыўнай кінацэнзуры цалкам не спраўджвалі спадзяванні партыйнага кіраўніцтва. У 1965 годзе сцэнарна-рэдакцыйная калегія двойчы абмяркоўвала матэрыял фільма «Любімая» рэжысёра Віктарава. Але, па словах старшыні Дзяржкіно БССР Паўлёнка, заўвагі членаў калегіі толькі часткова палепшылі якасць карціны (Віктарава абвінавачвалі ў апашленні кахання, скажэнні сацыялістычнай рэчаіснасці і іншым). У выключных выпадках кінастудыя атрымлівала загад на забарону з «самага верху». Пасля разгромнай крытыкі творчасці Васіля Быкава на з'ездзе Саюза пісьменнікаў у 1966 годзе загадам з ЦК была спынена падрыхтоўка дыпломнай работы рэжысёра Мартынюка — фільма паводле аповесці Быкава «Пастка».

У кінавытворчасці саюзных рэспублік, у тым ліку ў БССР, ідэалагічны дыктат быў больш жорсткі, чым у Маскве. Беларускія кінематаграфісты існавалі ў рэжыме двайной цэнзуры, калі маскоўскія цыркуляры дапаўняліся службовай стараннасцю мясцовых улад. Пачынаючы з 1960-х гадоў, іх асаблівую ўвагу прыцягвалі спробы кінематаграфістаў

ЯК ПРАЦАВАЛА КІНАЦЭНЗУРА Ў БССР

сцэнарыя Уладзіміра Караткевіча: «Слава сыну божаму! Гора сыну чалавечаму!»

даць уласную інтэрпрэтацыю далёкіх і блізкіх падзей айчыннай гісторыі.

Адразу ж пасля вяртання з Вышэйшых сцэнарных курсаў у Маскве з беларускай кінацэнзурай сутыкнуўся Уладзімір Караткевіч. У 1963 годзе ён перадаў на «Беларусьфільм» свой дыпломны сцэнарый — філасофскую прытчу «Гнеўнае сонца палючае». З ім узяўся працаваць малады беларускі рэжысёр Ігар Дабралюбаў. Але ўвесь склад сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі на чале з Максімам Лужаніным выступіў супраць гэтага твора Караткевіча, і фільм не стаў рэальнасцю. У наступныя гады супрацоўніцтва пісьменніка з кінастудыяй было больш плённае — выйшлі знятыя па караткевічаўскіх сцэнарыях дакументальныя карціны «Сведкі вечнасці» (1964), «Памяць каменя» (1966), «Будзь шчаслівай, рака» (1967).

Аднак у 1965 годзе сцэнарый мастацкага фільма «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» зноў сустрэў супрацьдзеянне на ўзроўні сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі. Неўзабаве Дзяржкіно БССР атрымала адмоўны водгук на сцэнарый з Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў СССР. У ім, у прыватнасці, адзначалася, што аўтар «не паказвае шкоднасць рэлігійнай ідэалогіі...», «правакуе на нядобразычлівае стаўленне да веруючых». Асабліва разлавалі экспертаў савета апошнія словы сцэнарыя: «Слава сыну божаму! Гора сыну чалавечаму!» У 1967 годзе работу над карцінай спыняў асабіста начальнік Галоўнага ўпраўлення мастацкай кінематаграфіі Камітэта па кінематаграфіі пры Савеце Міністраў СССР. У 1968 г. ён жа адмовіўся прымаць карціну з-за «недакладнай ідэйнай канцэпцыі і стылістычнага рашэння». Перайменаваная ў «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка», пасля дванаццаці рэдактур, скарачэнняў і перазапісаў карціна ў рэшце рэшт была пакладзена «на паліцу», бо «шаржыраваны паказ царкоўнікаў крыўдзіў пачуцці вернікаў». Па словах яе рэжысёра Бычкова, у «Жыцці...» камусьці з кіраўніцтва ўбачыўся намёк на Хрушчова, якога, як і Хрыста, пакінулі ўсе верныя паплечнікі. Не менш палохала маскоўскае кіраўніцтва беларуская гісторыя, нацыянальны каларыт фільма.

З фільма «Я родам з дзяцінства» зніклі песні Высоцкага

У другой палове 1960-х гадоў маскоўскае кінакіраўніцтва выказвала заўвагі з мэтай «паляпшэння ідэйна-мастацкай якасці» беларускім карцінам «Колькі лет, колькі зім» (рэжысёр — Фігуроўскі), «Тысяча вокнаў» (рэжысёры — Спешнеў і Рагавы). У 1967 годзе яно адхіліла сцэнарый фільма «Я, Францыск Скарына» Садковіча, а кінастудыі «Беларусьфільм» рэкамендавалі сканцэнтравацца на вытворчасці сцэнарыяў, прысвечаных тагачаснай беларускай рэчаіснасці. Годам раней па ўказанні з Масквы з мастацкага фільма рэжысёра Турава «Я родам з дзяцінства» зніклі песні Высоцкага «Пра шпіталь» і «Штрафныя батальёны», у якіх надта моцна адчуваўся іх аўтар.

Цяжка ствараліся рэжысёрам Туравым мастацкія фільмы па раманах Алеся Адамовіча «Вайна пад стрэхамі» і «Сыны ідуць у бой». У іх уносілі праўкі прадстаўнікі ўсіх магчымых «інстанцый» — мастацкага савета кінастудыі, Дзяржкіно рэспублікі, аддзела культуры ЦК КПБ, Дзяржкіно СССР. Патрабавалі прыбраць пралог, прысвячэнне фільма, рэпліку гераіні, дзе яна згадвала сваіх раскулачаных бацькоў і іншае. Адамовіч быў сведкам, як рэжысёр даволі смела для таго часу супрацьстаяў «кастрацыі» дылогіі аб партызанах. Калі аднойчы сакратар ЦК па ідэалогіі Пілатовіч «выгаворваў» аўтарам, Тураў, не стрымаўшыся, запярэчыў: «А чаму вы лічыце, што ваша думка ў кіно самая галоўная?» Адказ быў безапеляцыйны: «Таму што мы пастаўлены кіраваць...» Больш падрабязна пра складаны шлях гэтых фільмаў да гледача распавёў сам Тураў ва ўспамінах пра Высоцкага: «Яны два з нечым года ляжалі на паліцах, іх сур'ёзна парэзалі, і цяпер яны існуюць зусім не ў тым выглядзе, як былі задуманы першапачаткова».

Па словах Алеся Адамовіча, больш за ўсё прэтэнзій на розных узроўнях да аўтараў было за негераічны паказ партызанскай барацьбы. Аўтараў жа цікавілі не баявыя дзеянні, а вайна ў саміх людзях, іх маральна-псіхалагічны стан. Да таго ж у фільмах песні Высоцкага былі агучаны іншым выканаўцам, бо голас Высоцкага не падабаўся прымаючым інстанцыям.

Пасля выхаду дылогіі Адамовіча і Турава на экраны яе цэнзурная гісторыя не скончылася. У лютым 1971 года ўпаўнаважаны Савета па справах рэлігій пры Савеце Міністраў БССР у сакрэтнай справаздачы сакратару ЦК Кузьміну ўстрывожана пісаў, што ў апошні час павялічыўся выпуск кінафільмаў, дзе прапагандуюцца царкоўныя службы. «Нядаўна выйшаў на экраны рэспублікі кінафільм «Вайна пад стрэхамі» рэжысёра В. Турава, дзе дэталёва паказана богаслужэнне. Незразумела, ці то аўтары хочуць расказаць пра партызанскую яўку, ці то паказаць царкоўную службу. Хутчэй за ўсё, другое, таму што сцэна яўкі ў фільме была неабавязковая».

Каб здаць мастацкі фільм, трэба было прайсці 13 інстанцый

Сродкам цэнзуры было тыражаванне мастацкіх фільмаў. Кіраўніцтва патрабавала павелічэння дэманстрацыі савецкага кіно і адпаведна змяншэння замежнага, перш за ўсё фільмаў «капіталістычных» краін, пракат якіх даваў найвялікшы прыбытак. 24 студзеня 1961 г. выйшла пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнні арганізацыі кінапракату», у выніку якой паступленне ў рэспубліку фільмаў вытворчасці «капіталістычных» краін значна паменшылася. Калі раней кінасетка БССР атрымлівала ў год 68 мастацкіх фільмаў, закупленых на Захадзе, то ў 1962 годзе атрымала іх толькі 20. Гэты паказчык утрымліваўся з невялікімі зменамі і надалей. Напрыклад, на 1967 год кіраўніцтва Дзяржкіно БССР замовіла ў Маскве 161 мастацкі фільм айчыннай вытворчасці (8914 копій), 60 фільмаў вытворчасці сацыялістычных краін (1802 копіі) і 24 фільмы вытворчасці «капіталістычных» краін (459 копій). Фільмы апошняй катэгорыі забаранялі паказваць на дзіцячых сеансах, па тэлебачанні, тыражаваць на вузкай стужцы. Вясковым гледачам на кінаперасоўках у 1967 г. паказалі толькі тры заходнія фільмы.

Апошні «брэжнеўскі» перыяд гісторыі савецкага кіно пачаўся з рэкорднай колькасці фільмаў, пакладзеных «на паліцу». Толькі ў 1968 годзе ў СССР іх было дзесяць. Пачынаючы з 1969 года колькасць «палічных» фільмаў скарачалася, бо пачала актыўна працаваць прэвентыўная цэнзура (сцэнарна-рэдакцыйныя калегіі і мастацкія саветы кінастудый). Кінапраекты імкнуліся не даводзіць да стану «палічных», бо студыям трэба было выконваць план і атрымліваць прэміі, а не вымовы і непрыемнасці. Прамым вынікам «прафілактычнай работы» розных інстанцый быў вал «шэрых» фільмаў, які захліснуў савецкі кінематограф у пачатку 1980-х гадоў.

Кінарэжысёр Міхаіл Пташук так апісвае работу тагачаснай сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Дзяржкіно СССР. «У самым цэнтры Масквы ёсць знакаміты асабняк, у якім яшчэ з трыццатых гадоў зацвярджаліся сцэнарыі, прызначаліся на пастаноўку рэжысёры — вырашаўся лёс усяго савецкага кіно. На чацвёртым паверсе ў маленькай душнай глядзельнай зале збіралася кіраўніцтва Дзяржаўнага камітэта па кінематаграфіі і члены Галоўнай сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Дзяржкіно СССР. Кожны займаў сваё любімае ў гэтай зале месца, і яны, як мышы, чакалі, калі зойме свае месца старшыня альбо ягоны намеснік — тады пачынаўся прагляд фільма. Рэжысёру адводзілася месца ў куце, каля пульта. Яму казалі, калі зрабіць гучней, а калі цішэй. Падчас прагляду ніхто не перагаворваўся, усе мелі з сабой блакнот і маленькі ліхтарык, каб падчас прагляду запісваць заўвагі. Усе сцэнарыі, якія былі ў запуску на студыях краіны, работнікі камітэта ведалі на памяць, таму што сцэнарыі і рэжысёры зацвярджаліся імі...

Афіша мастацкага фільма «Хрыстос прызямліўся ў Гародні».

Сцэнарый так фільтраваўся, што ад яго амаль нічога не заставалася. Пісалася некалькі варыянтаў, і па кожным варыянце прымаліся рашэнні, пісалася заключэнне за подпісам адказнага рэдактара Галоўнай сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Дзяржкіно СССР, накіроўвалася ў рэспубліку, дзе меўся такі ж Камітэт па кінематаграфіі з уласнай Галоўнай сцэнарна-рэдакцыйнай калегіяй, — тут прымалася рашэнне па атрыманым з Масквы заключэнні, і толькі тады накіроўвалася на студыю і рэжысёр мог з ім пазнаёміцца».

Іншы славуты беларускі кінарэжысёр Ігар Дабралюбаў падлічыў, што каб здаць мастацкі фільм у эпоху «застою», трэба было прайсці 13 інстанцый — «рэдакцыйны савет, мастацкі савет, іншыя саветы, сцэнарная калегія Дзяржкіно БССР, ЦК КПБ, Дзяржкіно СССР...»

«Да мяне прыйшоў узброены нажніцамі чыноўнік з ваеннай цэнзуры і вельмі спрытна стаў рэзаць гатовую карціну проста на маіх вачах»

У 1969 годзе мастацкі савет «Беларусьфільма» прыняў, але забараніў на шырокім экране паказ дакументальнага фільма «Маршрут 13» (рэжысёр — Гаско), які быў прысвечаны першаму беларускаму рок-фестывалю, што адбыўся ў Мінску ў 1968 годзе (у 1977 годзе негатыў фільма ўвогуле змылі). Фільму не пашанцавала, бо здымаць яго пачалі да пачатку падзей у Чэхаславакіі, а здавалі мастацкаму савету ўжо пасля іх.

У справаздачы маскоўскаму кіраўніцтву за 1969 год начальнік Галоўліта БССР Маркевіч з неспакоем адзначаў, што «ў апошні час павялічыліся выпадкі прадстаўлення фільмаў кінастудыяй «Беларусьфільм» на кантроль без папярэдняга ўзгаднення з ваеннай цэнзурай». Вось як згадвае работу ваеннага цэнзара рэжысёр Дабралюбаў: «Нягледзячы на тое, што кансультантам фільма, прысвечанага лётчыкам-знішчальнікам «Таму што люблю», быў маршал авіяцыі М. С. Скрыпко, да мяне прыйшоў узброены нажніцамі чыноўнік з ваеннай цэнзуры, з засаленымі на локцях рукавамі... сеў і вельмі спрытна, прафесійна стаў рэзаць гатовую карціну проста на маіх вачах. Сэрца маё скаланулася:

— А... а... А сюжэт!?

— Што-небудзь прыдумаеце.

Здавалася, мяне аперыруюць: адразаюць руку, нагу, галаву. Я не вытрымаў і сышоў. Ён павольна дарэзаў усё, што хацеў, я толькі паглядзеў потым, што засталося — скласці з гэтага нават прыблізна добрую карціну было немагчыма».

Паралельна з актывізацыяй дзейнасці Галоўліта, ваеннай цэнзуры, а таксама прэвентыўнага цэнзурнага кантролю Дзяржкіно, узмацнілася ўвага да кінапрадукцыі партыйнага кіраўніцтва, якое па-ранейшаму валодала правам апошняга слова, альбо звышцэнзуры.

Дакументальны фільм Лысятава «Бацькоўскае поле», дзе асцярожна ўздымаліся сацыяльныя праблемы вёскі, напрыклад, масавы ад'езд моладзі ў горад, на афіцыйнай здачы быў прызнаны шкодным. Фільм паслалі на экспертызу віцебскаму партыйнаму кіраўніцтву (здымкі праводзіліся на Віцебшчыне), і тое нечакана яго падтрымала. Неўзабаве фільм падтрымаў Пётр Машэраў, і толькі пасля гэтага ён выйшаў на экраны. Машэраў выступаў арбітрам у спрэчках паміж рэжысёрам Дабралюбавым і загадчыкам аддзела культуры ЦК КПБ Антановічам падчас здымак карціны «Трэцяга не дадзена», прысвечанай партызанскаму камандзіру Васілю Каржу.

Увесну 1977 года ў Мінску адбыўся прэм'ерны закрыты паказ фільма Ларысы Шэпіцькі «Узыходжанне» па аповесці Васіля Быкава «Сотнікаў». На паказ з'явіўся Машэраў, які ведаў, што да фільма рэзка адмоўна ставіцца сакратар маскоўскага гаркама КПСС Грышын. Калі пасля заканчэння фільма ў зале ўключылі святло, заплаканы беларускі кіраўнік кінуўся цалаваць рэжысёрку: «Як жа вы, такая маладая дзяўчына, як жа вы здолелі?.. Так дакладна ўсё адчулі, убачылі, паказалі нас, партызан...»

Праз некалькі гадоў пасля публікацыі аповесці Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» на хвалі яе шалёнай папулярнасці ў 1979 годзе рэжысёр Валерый Рубінчык зняў па матывах аповесці фільм-прытчу. Каб дагадзіць цэнзарам, Караткевічу і Рубінчыку давялося неаднойчы рэдагаваць сцэнарый. У выніку шматлікіх пераробак фільм атрымаўся не столькі экранізацыяй караткевічаўскай аповесці, колькі самастойным мастацкім творам Рубінчыка. У ім была парушана храналогія падзей, дададзены «экшн», прыбраны нацыянальны каларыт і маналогі цэнтральнага персанажа аб нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. І тым не менш пасля прагляду фільма ў закрытай кіназале ЦК КПБ ў снежні 1979 года змрочны Машэраў устаў і рэзюмаваў: «Крок назад у беларускім кіно».

Неўзабаве пасля смерці галоўны кінаглядач рэспублікі сам зрабіўся аб'ектам цэнзурнай забароны. Па загадзе партыйных органаў дакументальны фільм пра пахаванне першага сакратара ЦК КПБ Машэрава быў пакладзены на паліцу. Камусьці «наверсе» паказ народнай любові да першага прыйшоўся недаспадобы.

Дзіцячае кіно выклікала ўвагу цэнзараў не менш за дарослае. Дабралюбаў наступным чынам згадваў, як у Маскве прымалі яго дзіцячы фільм «Іван Макаравіч»: «Ім не падабалася, што галоўны герой спявае «Песню пра трохкутнік» Высоцкага. У рэдактуры Дзяржкіно СССР нам растлумачылі: «Значыцца, так. З'язджайце дамоў у Мінск, выражце гэтую сцэну і выразаную частку прывязіце, тады будзем далей весці гаворку». Дзіцячы фільм кінарэжысёра Мартынюка «Сямейныя абставіны» па аповесці Альберта Ліханава «Падман» выйшаў вузкім пракатам з грыфам «Педагогам — толькі для спецыяльных сеансаў». Паклалі на паліцу дакументальны фільм Ждановскага па сцэнарыі Пісьменнай і Раманава — у ім былі зняты пяцікласнікі адной з мінскіх школ, якія на ўроку разважалі пра катэгорыі свабоды і нявольніцтва.

Новы перыяд развіцця савецкага кіно вызначыў V з'езд кінематаграфістаў СССР, які адбыўся ў маі 1986 года. Адпаведна з адным з яго рашэнняў пры Саюзе кінематаграфістаў СССР паўстала канфліктная камісія, якая распачала разгляд «палічных» фільмаў і выпуск іх у пракат. Усе пацярпелыя карціны падзяляліся на безумоўна забароненыя, скалечаныя цэнзарскімі нажніцамі і фільмы фармальнага пракату, што атрымалі мізэрны тыраж копій. Члены камісіі па кожным фільме рыхтавалі заключэнне, якое перадавалася на разгляд у Дзяржкіно СССР, а калі забарона сыходіла з ЦК КПСС, дык патрабавалася ўзгадненне «на самым версе». За чатыры гады работы канфліктная камісія вярнула гледачу каля 250 карцін, адыграўшы, такім чынам, важную ролю ў дэмантажы інстытута кінацэнзуры. Сярод гэтых карцін быў фільм «Жыццё і ўзнясенне Юрася Братчыка».

Аляксандр ГУЖАЛОЎСКІ,
доктар гістарычных навук.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 15 января 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 70 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условие продажи: 1. Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества, на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. 2. Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **Местонахождение лотов:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8			
2	Цифровая инженерная система OCE, инв. № 61398	**5 550,00**	555,00
5	Станок токарно-винторезный ГС-526У-01, инв. № 60479	**6 210,00**	621,00
6	Станок токарно-винторезный ГС-526У-02, инв. № 60791	**20 370,00**	2 037,00
9	Вертикальный консольно-фрезерный станок со столом FSS450R, инв. № 60459	**13 620,00**	1 362,00
10	Аппарат копировальный многофункциональный KYOGERA KM-3650W(эра), инв. № 60882	**630,00**	63,00
12	Станок токарно-карусельный 1541, инв. № 134	**7 710,00**	771,00
14	Вальцы для гибки двутавра, инв. № 50602	**4 230,00**	423,00
18	Трактор сварочный MZ1000, инв. № 60411, 60412	**2 280,00**	228,00
20	Комплект сварочного полуавтомат Варио Синержик 5000-2 ZA-Евро, инв. № 60808	**480,00**	48,00
21	Полуавтомат сварочный Origo Mig 502c, инв. № 61214	**2 400,00**	240,00
22	Сварочный трактор RILON, инв. № 61395	**1 770,00**	177,00
26	Станок радиально-сверлильный ГС545, инв. № 60661	**6 870,00**	687,00
27	Станок радиально-сверлильный ГС545, инв. № 61145	**8 010,00**	801,00
28	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60944	**4 890,00**	489,00
29	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60945	**4 890,00**	489,00
30	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60946	**4 890,00**	489,00
31	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60947	**4 890,00**	489,00
32	Плита монтажная 1.5*3000, инв. № 60948	**4 890,00**	489,00
34	Установка для сборки балок HZJ -1800, инв. № 61312	**34 200,00**	3 420,00
35	Механизм подачи PDE-41W, инв. № 60787	**480,00**	48,00
36	Сварочный аппарат HUGONG THMIG-500 в к-те, инв. № 60820	**480,00**	48,00
37	Кондиционер G12LHP, инв. № 60969	**150,00**	15,00
38	Кондиционер G12LHP, инв. № 60970	**150,00**	15,00
39	Кондиционер G12LHP, инв. № 60971	**150,00**	15,00
40	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60975	**210,00**	21,00
43	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60917	**210,00**	21,00
45	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60918	**210,00**	21,00
46	Кондиционер LG S18LHP, инв. № 60919	**210,00**	21,00
48	Кондиционер LG S24H, инв. № 60655	**240,00**	24,00
49	Кондиционер Panasonic 18 DKD, инв. № 60653	**180,00**	18,00
50	Кондиционер Panasonic 18 DKD, инв. № 60654	**180,00**	18,00
52	Водогрейный котел на МТВ, инв. № 61103	**8 100,00**	810,00
53	Водогрейный котел на МТВ, инв. № 61104	**8 100,00**	810,00
54	Сварочный аппарат Herman Shark 505M, инв. № 61332	**6 000,00**	600,00
55	Сварочный аппарат Herman Shark 505M, инв. № 61224	**5 700,00**	570,00
56	Пригрузы большие, инв. № 61050	**180,00**	18,00
57	Пригрузы большие, инв. № 61051	**180,00**	18,00
58	Пригрузы большие, инв. № 61052	**180,00**	18,00
59	Пригрузы большие, инв. № 61053	**180,00**	18,00
60	Пригрузы большие, инв. № 61054	**180,00**	18,00
61	Электропечь SNOL 30/1300, инв. № 61357	**1 200,00**	120,00
62	Компрессор воздушный винтовой L55-09F, инв. № 60593	**8 400,00**	840,00
63	Компрессор воздушный винтовой L55-09F, инв. № 60594	**8 400,00**	840,00

Продавец: открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 303-53-09 Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**;

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 29 декабря 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 13 января 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество, согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. Постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 02.06.2020 г. № 105 (29219). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232)23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8(029)126-66-62.

Извещение о проведении 19 января 2021 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МТЗ»

Предмет торгов (сведения о продаваемом имуществе)	Капитальное строение с инвентарным номером 601/С-13331, общая площадь – 250,8 кв. м, наименование – столовая, назначение – здание специализированное для общественного питания, составные части и принадлежности: одноэтажная кирпичная столовая с пристройкой 1, навесом 2, сараем 3, в том числе устройство стоянки на 10 автомобилей а1, металлическое ограждение столовой а2, водоотводной канал возле столовой а3, ограждение столовой а4, благоустройство территории вокруг столовой а5, система водоснабжения столовой а6, система канализации столовой а7, система наружного освещения столовой а8; котел КЧУ-7-63А «Эффект» зав. № 3858 (инв. № 196338), система пожарной сигнализации столовой «Логоза» (инв. № 175819), система охранной сигнализации столовой «Логоза» (инв. № 175839)
Местонахождение продаваемого имущества	Минская обл., Логойский р-н, Гайненский с/с, д. Логоза, ул. Центральная, 1
Сведения о земельных участках	Площадь – 0,1032 га, кадастровый номер 623284502604000021, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой. Площадь – 0,0148 га, кадастровый номер 623280806404000022, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания столовой
Продавец имущества	ОАО «МТЗ», 220070, г. Минск, ул. Долгобродская, 29
Организатор торгов	Государственное предприятие «МГЦН», 220030, г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10
